

Падатку на «дармаедаў» не будзе. Пакуль

СТАР 2



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



Што глядзець у навагоднюю ноч?

СТАР 3

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 СНЕЖНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 243 (27608) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПА ЎСІМ СПЕКТРЫ

**Беларусь і Расія вырашылі ўсе вострыя пытанні двухбаковых адносін, заявіў Аляксандр Лукашэнка 25 снежня ў Маскве па выніках пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота БЕЛТА.

Парадак дня ВДС уключаў амаль паўтара дзясятка пунктаў. Удзельнікі пасяджэння разгледзелі асноўныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў розных сферах. Да пачатку пасяджэння прэзідэнты Беларусі і Расіі правялі двухбаковую сустрэчу, каб зняць усе вострыя пытанні і абмеркаваць перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што цяперашняя форма правядзення двухбаковай сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў дзеяздольная, эфектыўная і прыжывецца ў далейшым.

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, Саюзная дзяржава на фоне значнага руху наперад па шляху еўразійскай інтэграцыі мае патрэбу ў якаснай мадэрнізацыі. Неабходна поўная выразнасць адносна спалучэння функцый Саюзнай дзяржавы і будучага Еўразійскага эканамічнага саюза, каб аб'яднанні не дубліравалі адзін аднаго.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў фармаце «двойкі» абкатваўся шэраг рашэнняў, якія цяпер паспяхова рэалізаваны ў «тройцы». «Лічу, што і ў далейшым за Саюзнай дзяржавай павінна захавацца роля ледакола ў вырашэнні складаных пытанняў», — сказаў ён.

У цэлым Прэзідэнт Беларусі канстатаваў інтэнсіўнае развіццё і двухбаковых беларуска-расійскіх адносін, і еўразійскіх інтэграцыйных працэсаў. Ён адзначыў, што ўпершыню за апошнія некалькі гадоў праводзіцца другое пасяджэнне ВДС за год.

«У 2013 годзе традыцыйна ішла рэалізацыя раней пачатых і новых сумесных праграм, што фінансуюцца з саюзнага бюджэту, цесна ўзаемадзейнічалі профільныя міністэрствы, супрацоўнічалі рэгіёны. Беспрэцэдэнтнага для постсавецкай прасторы ўзроўню дасягнула супрацоўніцтва ваенных, дыпламатаў і праваахоўнікаў», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён асабліва адзначыў зробленыя бакамі захады па ўмацаванні рэгіянальнай групоўкі войскаў, узмацненні аховы знешняй граніцы і паветранай прасторы. На яго думку, гэта паказчык глыбіні двухбаковага ўзаемадзеяння. У гэтым кантэксце Прэзідэнт Беларусі згадаў паспяховыя сумесныя беларуска-расійскія стратэгічныя вучэнні «Захад-2013».

СТАР 2

## ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ:
### парнёрскія, даверныя адносіны павінны забяспечваць яго высокую эфектыўнасць

**Беларусь, Казахстан і Расія поўныя рашучасці падпісаць дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕЭС) у вызначаныя раней тэрміны. Аб гэтым 24 снежня заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка журналістам па выніках праведзенага ў Маскве пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

У парадку дня саміту было каля дзесяці пытанняў. Прэзідэнты абмеркавалі тэмы далейшага развіцця інтэграцыйнага ўзаемадзеяння і далучэння да яго новых краін. Спачатку пасяджэнне прайшло ў вузкім складзе, а затым да кіраўнікоў «тройкі» далучыліся прэзідэнты Кыргызстана і Арменіі і прэм'ер-міністр Украіны.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што работа па інстытуцыянальнай частцы праекта дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе ў цэлым завершана. Разам з тым некалькі важных пазіцый не былі ўзгоднены на экспертным узроўні, і гэта перашкаджае краінам рухацца далей.

Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу, што ў першую чаргу размова ідзе аб тым, ці будзе саюз міжнароднай арганізацыяй. «З'явілася меркаванне, што аб арганізацыі гаварыць рана, паколькі незразумела, што ў нас атрымаецца ў выніку», — сказаў беларускі лідар.

СТАР 2

## «ПАРТЫЗАНСКАЯ ЁЛКА»



Фота БЕЛТА.

**У Віцебску адбылася ваенна-гістарычная рэканструкцыя «Партызанская ёлка», падчас якой можна было ўбачыць, як партызаны святкавалі навагодняе свята. І... немцы таксама. Перанесціся ў часе дапамаглі хлопцы і дзяўчаты з віцебскай групы ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Таварышы па зброі».**

**Незвычайнае мерапрыемства прайшло на тэрыторыі Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова.**

СТАР 2

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, намеснік міністра фінансаў**

***«Галоўная задача для ўрада на бліжэйшы год — забяспечыць раўнавагу і ўстойлівасць на фінансавым рынку. Нават калі для гэтага давядзецца паступіцца ростам ВУП або фінансаваннем асобных дзяржпраграм. Важна, што сёння ў нас ёсць магчымасць забяспечыць макрафінансавую збалансаванасць без крайніх мер — такіх, напрыклад, як дэвальвацыя нацыянальнай валюты».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.12.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9490,00 | ▲ |
| Еўра | 12990,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 290,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1160,86 | ▲ |

■ Надвор'е

### АДЛІГА «ЗАЧЭПІЦЬ» НАВАТ СТУДЗЕНЬ

**Анамальна цёплае надвор'е ў нашай краіне захаваецца і ў бліжэйшыя шэсць дзён, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

У пятніцу да нас завітаюць цёплыя і вільготныя паветраныя масы з боку Чорнага мора, якія прынясуць у асобныя раёны невялікія дажджы. Месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра плюс 1-6 градусаў, па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей — да 8 цяпла. Характар надвор'я істотна не зменіцца і ў суботу. У асобных раёнах чакаюцца невялікія ападкі, пераважна ў выглядзе дажджу. Уначы і раніцай на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на суботу ад мінус 2 да плюс 3, удзень — 0-5 цяпла, па паўднёвым захадзе краіны да плюс 8 градусаў. Уначы на нядзелю без істотных ападкаў, а ўдзень месцамі, пераважна па паўночным захадзе Беларусі — дажджы. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 1-6 цяпла, па паўднёвым захадзе да плюс 8 градусаў. Месцамі мокры снег і дождж прагназуюцца на тэрыторыі нашай краіны ў панядзелак. Амаль паўсюдна чакаецца туман і галалёдныя з'явы. Тэмпература ўначы на панядзелак — ад мінус 2 да плюс 4 градусаў, удзень — 0-5 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, 31 снежня і ў першы дзень новага года надвор'е будзе вызначацца пад уплывам зоны павышанага ціску. Адліга працягваецца, але крыху пахаладае. Толькі ў асобных раёнах магчымы невялікія ападкі. На дарогах месцамі галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — ад мінус 2 да плюс 3.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Нашы дзеці

## КАБ МАРЫ КОЖНАГА ЗБЫЛІСЯ!

**Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ у рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» павіншаваў з надыходзячым Новым годам і Калядамі пацыентаў 3-й дзіцячай гарадской клінічнай бальніцы Мінска, перадае БЕЛТА.**

Кіраўнік урада пажадаў усім — і дзецям, і іх бацькам, абслуговаму персаналу — у першую чаргу моцнага здароўя. «Для дзяцей яшчэ і цікавых захапленняў, а таксама каб са школы яны прыносілі толькі выдатныя адзнакі, радуючы сваімі поспехамі бацькоў, дзядуляў і бабуль», — сказаў Міхаіл Мяснікові́ч.

Прэм'ер-міністр адзначыў: «Стала ўжо добрай традыцыяй, калі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы — кіраўніцтва і члены ўрада, парламента, Адміністрацыі Прэзідэнта і сам кіраўнік дзяржавы прыходзяць да дзяцей. Прычым не толькі з нагоды Новага года, паколькі ў рэспубліцы пытанням сям'і і дзяцінства ўдзяляецца шмат увагі».



Фота БЕЛТА.

Паколькі Новы год гэта перш за ўсё сямейнае свята, Міхаіл Мясніковіч пажадаў дзецям хутчэйшага выздараўлення, каб яны змаглі сустрэць гэта цудоўнае свята ў асяроддзі родных і блізкіх. Напярэдадні Новага года прэм'ер-міністр не мог прыйсці з пустымі рукамі і падарыў установе аховы здароўя тэлевізар. Цяпер маленькія пацыенты змогуць глядзець свае любімыя тэлеперадачы, што аблегчыць іх знаходжанне ў бальніцы. Зразумела, не абышлося і без ласункаў.



**Самыя цёплыя пажаданні гучалі і падчас навагодняга ранішніка, які адбыўся ў сценах мінскай дапаможнай школы-інтэрната №7. Гэтая навучальная ўстанова вядомая тым, што ў ёй набывае веды дзятва, якой з-за стана здароўя неабходны спецыяльныя навучальныя праграмы. Вучацца тут таксама і так званыя сацыяльныя сіроты.**

Казачныя Дзед Мароз і Снягурка збіраюцца наведаць школьнікаў праз пару дзён. Па сакрэце кажучы, яны з дапамогай валанцёраў рыхтуюць зараз падарункі — згодна з пажаданнямі, выказанымі ў дзіцячых лістах. А сёння вучні сустракалі рэальных гасцей, якія таксама паспрыялі таму, каб навагоднія мары збыліся.

**Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ** прыехаў на гэты ранішнік з падарункам, неабходным дзецям для вучобы і адпачынку. Ён перадаў школе вялізны лічбавы тэлевізар. Салодкія падарункі парадавалі малых не меней.

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У КІТАІ АДЗНАЧЫЛІ 120-ы ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ МАА ЦЗЭДУНА

Улады Кітая арганізавалі 26 снежня святочныя мерапрыемствы ў гонар 120-й гадавіны з дня нараджэння былога кітайскага лідара Маа Цзэдуна, піша кітайская газета The Global Times. ЦК кампартыі КНР правёў у гэты дзень урачыстае пасяджэнне, на якім выступаў, у прыватнасці, старшыня КНР Сі Цзіньпін. Перад гэтым кіраўніцтва краіны наведала маўзалей Маа Цзэдуна ў Пекіне, адзначае кітайскае агенцтва «Сіньхуа». Урачыстыя мерапрыемствы працягваюцца ў краіне з пачатку тыдня. У правінцыі Хунань, адкуль родам заснавальнік КНР, прайшоў сімпозіум, прысвечаны былому нацыянальнаму лідару, а таксама ўрачыстая цырымонія і канцэрт у яго гонар. Маа Цзэдун кіраваў створанай ім Кітайскай Народнай Рэспублікай з 1949 года аж да сваёй смерці ў 1976 годзе. Галоўнымі этапамі яго праўлення сталі «Вялікі скачок», скіраваны на інтэнсіўную мадэрнізацыю краіны, а таксама «Культурная рэвалюцыя».

### РАСІЙСКІЯ ЭКСПЕРТЫ ПАЦВЕРДЗІЛІ НАТУРАЛЬНУЮ СМЕРЦЬ АРАФАТА

Палестынскі лідар Ясір Арафат памёр сваёй смерцю, паведаміў у чацвер журналістам кіраўнік расійскага Федэральнага медыка-біялагічнага агенцтва Уладзімір Уйба. «Чалавек памёр сваёй смерцю, а не ад радыяцыйнага ўздзеяння... Была досыць амбіцыйная заява швейцарцаў, але яны яе знялі і пагадзіліся з нашай, французы пацвердзілі нашы высновы», — сказаў ён. Удава Арафата Суха Арафат абвясціла раней, што мае намер аспрэчыць вынікі французскага медыцынскага заключэння пра абставіны смерці яе мужа, у адпаведнасці з якімі французскія судмедэксперты выключылі версію аб яго атручванні. Высновы спецыялістаў з Францыі разышліся з заключэннем іх швейцарскіх калег, якія выявілі ў біялагічных узорах павышаную колькасць радыеактыўнага палонія-210.

### У ЗША І КАНАДЗЕ АХВЯРАМІ СНЕЖНЫХ БУР І ТАРНАДА СТАЛІ ДЗЯСЯТКІ ЧАЛАВЕК

У ЗША і Канадзе каля паўтара мільёна жыхароў засталіся без электразабеспячэння і прынамсі 27 чалавек загінулі з-за шторму і снегападаў, якія накрылі ўсходняе ўзбярэжжа і цэнтральную частку Паўночнай Амерыкі. Па звестках CBS News, большасць загінулых атруціліся чадным газам, спрабуючы абагрэць свае дамы з дапамогай рэзервовых газавых генератараў або барбекю. Вялікая колькасць людзей загінула ў шматлікіх ДТЗ. У штаце Місісіпі, па звестках выратавальных службаў, два чалавекі сталі ахвярамі тарнада. Моцныя парывы ветру перакульвалі тут нават грузавікі.

### ШКОДНЫЯ ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ АСЛАБЛЯЮЦЬ МОЗГ



Аўстралійскія навукоўцы заяўляюць: яны высветлілі, як звязаны прадукты з вялікай колькасцю цукру і тлушчу са зніжэннем кагнітыўных здольнасцяў, перадае Gothamist. Эксперымент паказаў, што праз шэсць дзён знаходжання на падобнай дыеце ў пацукоў пагоршылася памяць. Як адзначае аўтар даследавання Маргарэт Морыс, такая высокая хуткасць зніжэння здольнасцяў шакіруе. Было зафіксавана запаленне ў гіпакампе — зоне мозга, якая адказвае за фарміраванне і захоўванне ўспамінаў. Эфект, аналагічны таму, што назіраўся ў пацукоў, адзначаўся і ў людзей. У іх зніжалася выканаўчая функцыя мозга, у прыватнасці, хуткасць рэакцыі. І гэтыя змены назіраюцца ўжо праз пяць дзён пасля пачатку спажывання шкодных прадуктаў. Гэта асабліва небяспечна з пункту гледжання старэння арганізма. Разам гэтыя фактары значна ўзмацняюць пагаршэнне памяці і зніжэнне кагнітыўных здольнасцяў.

ISSN 1990 - 763X

13243

9 771990 763008

### КОРАТКА

У Беларусі з 2014 года пашыраецца прымяненне льгот сацыяльнага характару па ПДВ. У прыватнасці, з 1 студзеня 2014 года льготу па ПДВ пры рэалізацыі сацыяльных паслуг змогуць прымяняць недзяржаўныя некамерцыйныя арганізацыі ў форме стацыянарнага сацыяльнага абслугоўвання.

Амаль 83 тыс. чалавек наведалі калядныя богаслужэнні, якія прайшлі ў каталіцкіх храмах Беларусі ў ноч на 25 снежня.

Закупачныя цэны на малако павысіліся з 25 снежня. Цана на малако гатунку экстра павялічылася з Br3,891 млн за тону да Br4,280 млн, малако вышэйшага гатунку — з Br3,352 млн да Br3,687 млн, першага гатунку — з Br3,091 млн да Br3,400 млн.

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені—лістападзе 2013 года склала Br5075,8 тыс. (у лістападзе яна была Br5348,8 тыс.).

Квота на вытворчасць тэкілы ў Беларусі ў 2014 годзе будзе павялічана ў параўнанні з 2013 годам у 1,9 раза да 15 тыс. дал, вінаградных він — на 7 працэнтаў да 3 955 тыс. дал.

## ПРЭСА З ВОДАРАМ КАВЫ

**Напярэдадні свята Новага года «Белсаюздрук» зрабіў мінчанам свой чарговы падарунак: на сталічным праспекце Любімава адкрыўся новы гандлёвы павільён. Тут можна не толькі набыць свежую газету, але і пачаставацца смачнай выпечкай за кубкам кавы.**

Кіёск такога тыпу ўжо пяты па ліку ў Мінску. Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі, які прысутнічаў на ўрачыстым адкрыцці павільёна, прызнаўся, што ідэю запазычылі на Захадзе, але адаптавалі для Беларусі.

— У такім павільёне можна набыць не толькі друкаваную прадукцыю, але і цацку для дзіцяці, канцылярскія тавары, выпіць кубак кавы, — расказаў Алег Праляскоўскі.

Па словах міністра, адкрыццё кіёскаў «Белсаюздрук» з пашыраным асартыментам продажу тавараў і паслуг — гэта як клопат пра будучыню прадпрыемства, так і спроба даць пакупніку магчымасць набыць неабходныя спадарожныя тавары, не выязджаючы ў спецыялізаваную краму. Алег Праляскоўскі нагадаў, што адным з галоўных напрамкаў дзейнасці РУП «Белсаюздрук» у надыходзячым годзе будзе яго шчыльнае супрацоўніцтва з ААТ «Белкніга».

— На інтэрнэт-сайце «Белкнігі» сёння можна заказаць любы друкаваны тавар, і яго прывязуць у бліжэйшую да пакупніка кніжную краму. Хочацца, каб магчымасць дастаўкі кніг была таксама і ў павільёны «Белсаюздрука», — лічыць міністр інфармацыі краіны. — Заказаў кнігу, яе прывезлі ў кіёск побач з домам, адтуль ты яе і забраў.



Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

Алег Праляскоўскі таксама закрануў тэму зніжэння цікавасці да друкаваных выданняў, што з'яўляецца вынікам павелічэння ролі інтэрнэту ў жыцці грамадства. Міністр падкрэсліў, што, нягледзячы на штодзённы тыраж рэспубліканскіх газет у мільён экзэмпляраў, 60% чытачоў аддаюць перавагу прагляду навін у інтэрнэце. Таму ў павільёнах «Белсаюздрука» ў хуткім часе з'явіцца Wi-Fi, пачнецца продаж прадукцыі на электронных насьбітах:

— Зробім Wi-Fi — моладзь не пакіне без увагі гэты факт. Заадно і кнігі паглядзіць, газеты, часопісы.

СТАР 2

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ПА ЎСІМ СПЕКТРЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на добрае развіццё двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін на фоне крызісу ў сусветным гандлі. Беларусь і Расія не толькі не знізілі аб'ёмы ўзаемнага тавараабароту, але нават прыбавілі без уліку энергетычнага складальніка. Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, гэта сведчыць аб тым, што значна прыбаўляе рэальны сектар. «Няхай наш тавараабарот і меншы, чым у мінулым годзе, але ён амаль на паўмільярда долараў перасягнуў узровень 2011 года», — сказаў беларускі лідар.

«Усё гэта можа здацца звычайным і руцінным. Але ў гэтым і заключаецца галоўнае дасягненне нашага праекта — мы сталі зусім натуральна, як належнае, успрымаць наша цеснае двухбаковае супрацоўніцтва. І такая арганічнасць — вынік шматгадовай карпатлівай работы», — заявіў Прэзідэнт Беларусі.

Разам з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў адсутнасць дынамікі ў пытанні дасягнення роўных правоў грамадзян Беларусі і Расіі ў сацыяльнай сферы. Ён падкрэсліў, што чакае ад Пастаяннага камітэта і ўрадаў дзвюх краін больш актыўных дзеянняў у гэтым напрамку.

У сваю чаргу Прэзідэнт Расіі адзначыў важнасць работы, праводзімай у рамках Саюзнай дзяржавы, для ўсіх інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы. Ён звярнуў увагу на тое, што ў Саюзнай дзяржаве па многіх напрамках работа ідзе з апярэджаннем і задае тон іншым інтэграцыйным аб'яднанням. На яго думку, усё гэта вельмі важна.

Па выніках пасяджэння ВДС Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Урады Беларусі і Расіі выпрацавалі рашэнні па самых вострых і складаных пытаннях парадку дня нашых адносін. Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што не засталося ніводнага пытання, якое мы маглі б паставіць перад расіянамі, або просьбаў, з якімі мы маглі б звярнуцца да расійскага боку. Мы вырашылі ўсе пытанні напярэдадні Новага года».

Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама падзякаваў расійскаму боку за праект па будаўніцтве ў Беларусі атамнай электрастанцыі. Як адзначыў Уладзімір Пуцін, агульная сума расійскага фінансавага ўдзелу складае $10 млрд. Ён нагадаў, што першы блок станцыі плануецца ўвесці летам 2018 года, другі блок — у 2020 годзе.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што дзякуючы Расіі Беларусь увайшла ў клуб касмічных дзяржаў, ствараючы сумесна з расіянамі касмічныя апараты, адзін з якіх працуе ўжо на арбіце. Ён расказаў, што бакі дамовіліся паскорыць стварэнне сумесных прадпрыемстваў па кааперацыі ў гэтай сферы.

Краіны прадаўжаюць супрацоўніцтва ў ваенна-прамысловай сферы. «Мы вельмі жорстка і рашуча будзем абараняць інтарэсы нашых дзяржаў, нашых грамадзян, забяспечваючы абарону Беларусі і Расіі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прынятыя на гэтым пасяджэнні рашэнні яшчэ раз сведчаць аб пашырэнні беларуска-расійскага ўзаемадзеяння па ўсім спектры работы. «Працэс стварэння ўмоў для развіцця і ўмацавання Саюзнай дзяржавы хоць і праходзіць няпроста, але дае практычную аддачу», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Уладзімір Пуцін паведаміў, што Расія прадаставіць Беларусі дадатковую пазыку да $2 млрд. «У ходзе сённяшняй сустрэчы ўрад Расійскай Федэрацыі прыняў рашэнне аказаць садзейнічанне нашым калегам у сувязі з тым, што адбываецца на сусветных рынках, і прадаставіць Рэспубліцы Беларусь дадатковыя пазыковыя сродкі ў 2014 годзе ў аб'ёме да $2 млрд», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, гэтыя сродкі — не падарунак Беларусі, і яны будуць працаваць на развіццё эканомік дзвюх краін. «Хацеў бы сказаць некаторым, якія крытыкуюць у нас у Беларусі за гэта і расіян у тым ліку, што ні ўрад Расіі, ні Прэзідэнт, якія ўмеюць добра лічыць грошы, нічога проста так не робяць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У якасці прыкладу ён прывёў той факт, што беларуская эканоміка спажывае ад 60 працэнтаў да 70 працэнтаў рэсурсаў і камплектуючых прадпрыемстваў Расіі, дзе працуюць, паводле прыкладных ацэнак, да 10 млн расіян. «Пачынаючы ад фінішнай вытворчасці, вы такім чынам падтрымліваеце і сваю эканоміку — расійскую», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на няпростую эканамічную сітуацыю ў свеце, у тым ліку ў Расіі, якая з'яўляецца асноўным спажыўцом беларускіх тавараў. Акрамя таго, Беларусь у выніку недружалюбных дзеянняў «Уралкалія», які абваліў сусветны калійны рынак, страціла больш як $1,5 млрд. Прэзідэнт Беларусі падзякаваў расійскаму боку за прынятыя рашэнні падтрымаць эканоміку Беларусі ў гэты вельмі цяжкі час.

У час пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія дамовіліся павышаць эфектыўнасць супрацоўніцтва ў сферы барацьбы з карупцыяй, падпісаўшы адпаведнае міжурадавае пагадненне.

Традыцыйна абмяркоўваўся бюджэт Саюзнай дзяржавы. Яго аб'ём на 2014 год складае амаль 5 млрд расійскіх рублёў. Гэтыя рэсурсы будуць накіраваны на фінансаванне больш як 36 сумесных праграм і мерапрыемстваў.

Яшчэ адной важнай тэмай, вынесенай на ВДС, стала падрыхтоўка да святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў расійскаму боку за каласальную падтрымку на міжнароднай арэне ў цяжкую мінуту націску на Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў гатоўнасць усіх беларускіх аб'ектаў, пабудаваных да зімовай Алімпіяды ў Сочы. «Мы з гэтай задачай справіліся і, як абяцалі, пабудавалі ўсе нашы аб'екты. Яны ўсе функцыянуюць і поўнасцю заняты, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — І для расіян, і для беларусаў мы стварылі цудоўны курорт сусветнага ўзроўню, дзе будзе прыемна адпачываць і летам, і зімой».

# МІТРАПАЛІТАМ МІНСКІМ І СЛУЦКІМ НАЗНАЧАНЫ РАЗАНСКІ АРХІРЭЙ ПАВЕЛ

**Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім назначаны мітрапаліт Разанскі і Міхайлаўскі Павел, паведамляе афіцыйны сайт Маскоўскага Патрыярхата.**



Фота БЕЛТА.

Праасвяшчэнны мітрапаліт Разанскі і Міхайлаўскі Павел нарадзіўся 19 лютага 1952 года ў Карагандзе ў сям'і рабочых. У 1973-1976 гадах вучыўся ў Маскоўскай духоўнай семінарыі. У 1980 годзе скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Рашэннем Свяшчэннага сінода ад 19 лютага 1992 года быў вызначаны епіскапам Зарайскім, кіраўніком Патрыяршымі прыходамі ў ЗША і часова ў Канадзе. У 1999 годзе назначаны епіскапам Венскім і Аўстрыйскім. У 2001 годзе ўзведзены ў сан архіепіскапа з тытулам Венскі і Будапешцкі. Рашэннем Свяшчэннага сінода ад 5-6 кастрычніка 2011 года прысвоены тытул Разанскі і Міхайлаўскі, назначаны кіраўніком новаўтворанай Разанскай мітраполіі. 8 кастрычніка 2011 года ўведзены ў сан мітрапаліта. 25 снежня Свяшчэнны сінод пастанавіў задаволіць прашэнне, пададзенае Праасвяшчэнным Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, аб адпраўленні яго на спачынак у сувязі з дасягненнем 75-гадовага ўзросту.



# ПРЭСА З ВОДАРАМ КАВЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч адзначыла, што ў 2013 годзе, які быў абвешчаны Прэзідэнтам краіны Годам кнігі, была значна пашырана чытацкая аўдыторыя кніжнага слова. А гандлёвыя павільёны «з пахам кавы» даюць магчымасць правільна прапанаваць пакупніку кнігу: яго вочы не будуць разбягацца перад кніжнай разнастайнасцю, якая сёння ёсць у вялікіх кніжных крамах. На паліцах новага кіёска на праспекце Любімава — навінкі беларускага кнігавыдання: каляровы альбом фотаздымкаў «Беларусь», «Жывая вера. Ветка», альбом малюнкаў Дзмітрыя Струкава:

— У кожнага тавару ёсць свой пакупнік. Калі сёння кніга «Галоўныя вуліцы Мінска» прыйшла сюды, на праспект Любімава, дзе жыве шмат прадстаўнікоў інтэлігенцыі, значыць, доўга ляжаць яна тут не будзе. Кніжнай групе ў такіх гандлёвых аб'ектах гарантаваны поспех, — упэўнена Лілія Ананіч.



Налета «Белсаюздрук» плануе падараваць мінчанам яшчэ пяць новых павільёнаў. Так, на вуліцах Касманаўтаў, Бурдзейнага, Адзінцова з'явяцца кіёскі, дзе можна будзе не толькі набыць газету і выпіць кубак кавы, але і набыць квіткі на розныя сталічныя мерапрыемствы, аформіць падпіску на любое друкаванае выданне, бясплатна падключыцца да інтэрнэту.

**Любоў БЯЛЯЕВА.**
**Фота аўтара.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## НАВАГОДНЯЯ КАЗКА

**У Кобрынскі дзіцячы дом навагоднюю казку прывезлі супрацоўнікі Брэсцкага аблвыканкама на чале са старшынёй Канстанцінам СУМАРАМ. Вядома, госці ўручалі дзецям падарункі: цацкі, цукеркі, настольныя (і не толькі) гульні.**

У дзіцячым доме жывуць хлопчыкі і дзяўчынкі ад 3 да 7 гадоў. Яны чакалі гэтага дня. І падрыхтавалі невялікі спектакль аб зачараванай планеце, дзе ўсё перамяшалася і пераблыталася. Але ж, як у кожнай казцы, павінен быць шчаслівы фінал. Ім стаў святочны карагод вакол ёлкі.

Паводле слоў дырэктара дзіцячага дома Алы Селівонік, сёння ва ўстанове жыве 65 дзяцей. За гэты год 12 выхаванцаў былі адпраўлены ў прыёмныя і апякунскія сем'і, дамы сямейнага тыпу і Кобрынскую дзіцячую вёску. І нават у навагоднім карагодзе было некалькі дзяцей, на якіх рыхтуюцца дакументы. Гэта значыць, што пасля свят па іх прыедуць мамы і таты.

Кіраўнік вобласці падкрэсліў, што вельмі важна пераводзіць дзяцей на сямейныя формы выхавання. Гэта работа і надалей будзе праводзіцца паслядоўна. На наступны год у вобласці запланавана ўзвядзенне чатырох аднакватэрных жылых дамоў для прыёмных сем'яў у Івацэвіцкім, Лунінецкім, Маларыцкім раёнах і горадзе Баранавічы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЦУДЫ Ў ДЗІЦЯЧЫМ ГАРАДКУ

**Міністр адукацыі Сяргей Маскевіч наведаў у рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» Дзіцячы гарадок, каб павіншаваць яго выхаванцаў з навагоднімі святамі.**

У адзіным у Беларусі Дзіцячым гарадку, размешчаным на тэрыторыі Ленінскага раёна сталіцы, пражываюць 78 дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў. З іх трое дзяцей-інвалідаў, трое — з разумовай адсталасцю і сем — з цяжкімі парушэннямі маўлення.

У цэнтры функцыянуюць 12 выхаваўчых груп. Абсталяваны дзве зоны адпачынку, спартыўная і гульнявая пляцоўкі, ёсць трэнажорная зала. Дзеці жывуць у гарадку па асаблівай, новай мадэлі. Умовы максімальна набліжаны да сямейных: выхаванцы размяшчаюцца ў спецыяльна ўладкаваных кватэрах, дзе ёсць кухня, жылыя пакоі, гасціная. Родныя браты і сёстры пражываюць у адной кватэры. Абавязкі бацькоў выконваюць выхавальнікі. Для стварэння сямейнага ўкладу арганізавана сумеснае вядзенне гаспадаркі бацькамі-выхавальнікамі і выхаванцамі, набыццё прадуктаў харчавання, асабістых рэчаў для дзяцей, сродкаў гігіены, прыгатаванне ежы, прыбіранне кватэры і арганізацыя сумеснага адпачынку.

Дэлегацыя Міністэрства адукацыі прыйшла ў госці не з пустымі рукамі. Дзеці атрымалі ў падарунак цацкі, спартыўны інвентар і салодкія сувеніры. Асабліва спадабаўся малым сухі басейн з мноствам невялікіх мячоў. «Цяпер мы будзем «купацца» нават у кватэры», — заявіў адзін з выхаванцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПРЫНЯЦЬ ХРЫШЧЭННЕ

**Дзеці са спецыяльных вучэбных устаноў закрытага тыпу г. Магілёва правялі незабыўны дзень у сталіцы дзякуючы ініцыятыве Хрысціянскага дабрачыннага камітэта «Вера — Надзея — Любоў».**



Фота Алены СЫСОЕВАЙ.

Паводле слоў кіраўніка арганізацыі Таццяны БОРЫНАЙ, сустрэлі дзяцей у Свята-Духавым кафедральным саборы, дзе амаль усе выхаванцы паспавядаліся ў архімандрыта Антонія і прычасціліся Святых Хрыстовых Тайнаў. Трое хлопчыкаў прынялі Святое хрышчэнне. Пасля гарачага абеду ў рэстаране «Застолле» выхаванцаў чакала знаёмства з жамчужынамі іканапісу Расіі, Украіны і Беларусі ў межах выставы Нацыянальнага мастацкага музея. А ў Мінскім дэльфінарыі большасць упершыню ўбачыла выступленне марскіх коцікаў і дэльфінаў. Дабрачынны камітэт таксама перадаў хлопцам кнігі, адзенне і салодкія падарункі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ЕЎРАЗІЙСКІ ЭКАНАМІЧНЫ САЮЗ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«Упэўнены, што саюз павінен быць менавіта міжнароднай арганізацыяй, якая будзе надзелена намі неабходнай правасуб'ектнасцю. Такі статус неабходны для эфектыўнага функцыянавання саюза. Ён зразумелы сусветнай супольнасці і нашым грамадзянам», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Рашэнне аб гэтым прымалася ўжо ў снежні 2012 года. На думку Прэзідэнта Беларусі, хісткасць у гэтым пытанні можа выклікаць непажаданыя меркаванні сярод праціўнікаў еўразійскай інтэграцыі, якіх нямала за межамі Мытнага саюза.

Беларускі бок выступае за дакладнае і прадметнае размежаванне кампетэнцый як самога саюза, так і дзяржаў-членаў, падкрэсліў Прэзідэнт. «Чым больш канкрэтна мы прапішам, хто чым павінен займацца, тым менш у нас потым будзе спрэчак, што хтосьці лезе не ў свае пытанні, — сказаў беларускі лідар. — Са сферамі кампетэнцыі саюза згадзіліся ўсе. Лагічна зрабіць і другі крок. Прапісаць, у якіх сферах нашы дзяржавы будуць мець кампетэнцыі, што рэалізуюцца ў фармаце ўзгодненай палітыкі».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на той нюанс, што неабходна дакладнае вызначэнне юрыдычнай сілы і іерархіі актаў саюза. Прэзідэнт Беларусі лічыць прынцыповым, каб рашэнні Вышэйшага і Міжурадавага саветаў былі не проста палітычнымі дакументамі, а абавязковымі для ўсіх бакоў нарматыўнымі актамі. На думку беларускага лідара, гэта дасць магчымасць эфектыўна працаваць і належным чынам кантраляваць дзейнасць Еўразійскай эканамічнай камісіі. «Інакш кіраўнікі дзяржаў не змогуць адмяніць рашэнні ЕЭК. А гэта нонсэнс», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь, Казахстан і Расія ствараюць Еўразійскі эканамічны саюз, у якім будзе функцыянаваць Адзіная эканамічная прастора, аб чым напісана ў рашэнні, прынятым у Астане ў маі гэтага года. Там таксама падкрэслена, што, «як правіла, без выключэнняў і абмежаванняў». Кіраўнік беларускай дзяржавы звярнуў увагу на тое, што ў пытанні забеспячэння свабоды перамяшчэння тавараў краіны рушылі значна далей, чым у сферах паслуг, капіталу і рабочай сілы, што лагічна, паколькі стварэнне Мытнага саюза пачалося раней, чым АЭП.

«Аднак нават па таварах мы не завяршылі работу. Нягледзячы на дасягнутыя ў «тройцы» дамоўленасці, застаюцца выключэнні, уключаючы алкагольную, тытунёвую прадукцыю, лекавыя сродкі, медыцынскія вырабы, газ, нафту, нафтапрадукты, аўтамабілі, рыбу і г.д. Упэўнены, што ісці ў эканамічны саюз, не завяршыўшы фарміраванне мытнага, вельмі рызыкоўна і наогул няправільна», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

«Свабода перамяшчэння тавараў павінна стаць своеасаблівым прыкладам для забеспячэння ўсіх іншых свабод. У адваротным выпадку нават неэканамістам зразумела, што ўся ідэя стварэння саюза і яго эканамічны сэнс могуць быць пастаўлены пад сумненне», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка выказаў нязгоду з меркаваннем, што абавязацельствы па дагавору не будуць закранаць абавязацельствы дзяржаў саюза ў пагадненнях з трэцімі краінамі. На яго думку, калі ў дагавор будзе закладзена такая норма, то пад пагрозу будзе пастаўлены сам працэс нтэграцыі.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу на тое, што разам з тым існуюць і двухбаковыя пагадненні ўнутры «тройкі». У некаторых з іх прапісаны больш спрыяльныя ўмовы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, чым гэта будзе прадугледжана дагаворам аб саюзе. «Лічу найважнейшым захаваць іх дзеянне і аб гэтым дакладна прапісаць у самім дагаворы, які мы рыхтуем. Перакананы, што такі падыход будзе садзейнічаць далейшаму развіццю інтэграцыйных працэсаў», — сказаў беларускі лідар.

Гаворачы аб функцыянальнай частцы дагавора, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яе гатоўнасць складае каля 30 працэнтаў. Нягледзячы на тое, што гэта лічба ўмоўная, такая сітуацыя насцярожвае, паколькі яшчэ не прапрацаваны шэраг раздзелаў. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў даручыць ЕЭК узмацніць работу па аналізу сумяшчальнасці зместу інстытуцыянальнай і функцыянальнай частак праекта дагавора.

Наступным этапам работы з'яўляецца ўзгадненне функцыянальнай, або галіновай, часткі праекта дагавора. Прэзідэнт Расіі звярнуў увагу на тое, што тэрміны сціслыя, тэкст дагавора павінен быць гатовы для падпісання да 1 мая 2014 года, а затым паступіць у парламенты. Таму неабходна нарасціць узаемадзеянне па лініі міністэрстваў, ведамстваў і экспертных груп, каб Еўразійскі эканамічны саюз пачаў функцыянаваць з 1 студзеня 2015 года.

Паводле слоў Уладзіміра Пуціна, галіновую частку дагавора неабходна максімальна насыціць канкрэтнымі абавязацельствамі ў сферы адзінай эканамічнай палітыкі. Акрамя таго, варта завяршыць кадыфікацыю ўсёй дагаворна-прававой базы Мытнага саюза і АЭП, ліквідаваць астатнія выключэнні з агульнага гандлёвага і інвестыцыйнага рэжыму, забяспечыць свабоду перамяшчэння тавараў, паслуг, капіталу і працоўных рэсурсаў.

На пасяджэнні прэзідэнты дамовіліся, што будуць скарачаць выключэнні, каб, у рэшце рэшт, звесці іх да нуля.

Прэзідэнт Расіі падкрэсліў, што еўразійская эканамічная інтэграцыя забяспечвае ўмовы для дынамічнага развіцця краін-удзельніц. «Нягледзячы на негатыўную глабальную кан'юнктуру, агульны рынак «тройкі» пашыраецца. У 2010-2012 гадах тавараабарот паміж нашымі краінамі павялічыўся амаль на трэць, — сказаў Уладзімір Пуцін. — У экспартна-імпартных аперацыях скарачаецца ўдзельная вага сыравінных тавараў, і на гэта мы сёння асабліва звярнулі ўвагу. Гэта вельмі важная частка нашай сумеснай работы».

Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў адзначыў, што стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза з'яўляецца інавацыйным праектам сучаснасці. Паводле яго слоў, гэта не спроба аднаўлення СССР, — і гэта агульная пазіцыя ўсіх краін-удзельніц. «Мы ідзём не назад, а наперад», — сказаў ён, дадаўшы, што гэта інтэграцыйнае аб'яднанне не з'яўляецца і паўтарэннем іншых такіх саюзаў.

Па выніках саміту прэзідэнты зацвердзілі дарожную карту па далучэнні Арменіі да Мытнага саюза і АЭП Беларусі, Расіі і Казахстана. Кіраўнікі дзяржаў таксама дамовіліся, што на экспертным узроўні прадоўжыцца работа над дарожнай картай па далучэнні да Мытнага саюза і АЭП Кыргызстана. Праект гэтага дакумента практычна гатовы.

Нурсултан Назарбаеў лічыць, што далучэнне да Мытнага саюза новых удзельнікаў не павінна ісці з захаваннем асаблівых рэжымаў. «Палавінчатага ўступлення не павінна быць», — сказаў ён.

Прэзідэнт Беларусі лічыць неабходным у поўным аб'ёме рэалізаваць дамоўленасці, якія былі ўжо дасягнуты пры фарміраванні адзінай эканамічнай прасторы, «узяць з Мытнага саюза і АЭП усё лепшае, стварыць такую прававую сістэму і структуру будучага саюза, якія забяспечаць яго высокую эфектыўнасць».

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што дагавор у цэлым набывае канкрэтныя абрысы, аднак работа наперадзе яшчэ вялікая. Паводле яго слоў, удакладнення запатрабаваў шэраг найбольш важных пазіцый, у прыватнасці па размежаванні кампетэнцыі саюза і дзяржаў-членаў, іерархіі актаў будучага аб'яднання.

«Калі мы не даб'ёмся таго, каб Еўразійскі эканамічны саюз пачаў працаваць у вызначаныя намі тэрміны — з 1 студзеня 2015 года, — гэта будзе ганьбай для ўсіх нас», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён падкрэсліў, што ў сувязі з гэтым краіны «тройкі» поўныя рашучасці за кароткі прамежак часу стварыць і падпісаць адпаведны дагавор.

«На нашу думку, найважнейшым пытаннем, звязаным з далейшым развіццём інтэграцыі, з'яўляецца стварэнне новага аб'яднання на базе Мытнага саюза, у якім няма ніякіх выключэнняў і абмежаванняў у гандлі таварамі паміж краінамі-ўдзельніцамі. Бо менавіта ў свабодзе руху тавараў мы зрабілі крок максімальна далёка», — сказаў беларускі лідар.

«Паўнацэнная свабода руху тавараў павінна стаць прыкладам для рэалізацыі астатніх свабод у сферах паслуг, капіталу і рабочай сілы, зафіксаваных у базавых пагадненнях АЭП», — лічыць Прэзідэнт Беларусі. Менавіта такі падыход, на думку беларускага боку, дасць магчымасць у самы кароткі тэрмін вырашыць амбіцыйную задачу па стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што праведзенае сумеснае абмеркаванне чарговы раз пацвердзіла гатоўнасць лідараў да прадаўжэння інтэграцыі. «Нам пад сілу прыйсці да кансэнсусу па ўсіх, нават самых вострых, пытаннях, — лічыць Прэзідэнт Беларусі. — Існуючыя паміж краінамі даверныя партнёрскія адносіны з'яўляюцца залогам далейшага развіцця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва».

# «ПАРТЫЗАНСКАЯ ЁЛКА»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Падчас ваенна-гістарычнай рэканструкцыі адбыліся прынягце прысягі на вернасць нашай Радзіме, адпрацоўка элементаў рукапашнага бою. Партызаны кухарылі, чыталі копіі газет ваеннага часу. Святкавалі і «немцы», якіх павіншаваў Санта Клаус. Але весяліцца ім давялося нядоўга, бо нашы раптам пайшлі ў атаку. І, вядома, «знішчылі» ворагаў і іх галоўнага казачнага персанажа.

Гледачы спускаліся ў бліндажы, дзе адноўлены партызанскі інтэр'ер. Супрацоўнікі музея ў свой час пастараліся стварыць усё такім, якім гэта было ў партызанаў.

У адной з музейных залаў былі паказаны новыя экспанаты: ёлачныя цацкі, выраблены ў канцы 1940-х — пачатку 1960-х гадоў, рарытэтныя запалкавыя каробкі, узнагароды ветэранаў Вялікай Айчыннай.

Вялікі інтарэс у наведнікаў выклікала графіка Бода Цымермана, немца, які знаходзіўся ў Віцебску падчас вайны. На творы — цэнтр разбуранага горада, вялікі храм, які, на жаль, не захаваўся да нашых дзён...

У музеі стараюцца расказваць пра значныя падзеі гісторыі, у тым ліку ажыццяўляючы розныя праекты. У прыватнасці, летась быў распрацаваны ўнікальны праект, прысвечаны 200-й гадавіне Айчыннай вайны 1812 года. Сёлетняй вясной працавала выстава «Гісторыя вайсковага мундзіра», на якой была прадстаўлена ваенная форма і рыштунак перыяду Вялікай Айчыннай вайны. А летам была арганізавана выставы твораў удзельнікаў моладзевага пленэру «Віцебшчына партызанская».

У супрацоўнікаў установы культуры ёсць цікавыя ідэі, як павялічыць колькасць наведнікаў, як зрабіць, каб маладое пакаленне з цікавасцю вывучала гісторыю роднай краіны, каб сучаснікі ведалі пра гераізм мінулых пакаленняў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Калектыў выдавецкага дома «Звязда» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядомага беларускага журналіста, няштатнага супрацоўніка і аўтара сканвордаў у газеце «Звязда», Аляксандра Андрэевіча ШАБАЛІНА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

■ Грошы

# ПАДАТКУ НА «ДАРМАЕДАЎ» НЕ БУДЗЕ. ПАКУЛЬ

**Пра гэта заявіў учора падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА Уладзімір Амарын, першы намеснік міністра фінансаў. Акрамя гэтага, ён распавёў пра дзяржаўны доўг, кошт ЧС па хакеі, развіццё рынку каштоўных папер і іншае. «Звязда» друкуе найбольш цікавыя адказы чыноўніка.**

## ХОЧАШ ІЛЬГОТЫ? ПРАЦУЙ

Насельніцтва апошнім часам актыўна абмяркоўвала верагоднае збіранне платы з «дармаедаў». Ёсць два варыянты: падатак, а таксама збіранне платы ў сацыяльнай плоскасці. «На нашу думку, людзі, якія не ўдзельнічаюць у фарміраванні валавога ўнутранага прадукту, не аплочваюць падаходны падатак у бюджэт краіны, а таксама адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны, хоць, нягледзячы на гэта, карыстаюцца льготамі па аказанні бясплатнай меддапамогі, на камунальныя паслугі і транспарт, атрымліваюць бясплатную адукацыю, павінны неяк кампенсаваць кошт гэтых паслуг альбо аплачваць іх, — сцвярджае Уладзімір Амарын. — Верагодней за ўсё, гэта будзе рабіцца з дапамогай сацыяльных картак. Пытанне іх увядзення цяпер толькі прапрацоўваецца. Дарэчы, ёсць вопыт еўрапейскіх краін, калі ўводзяцца так званыя сацыяльныя карткі і выкарыстоўваюцца пры атрыманні сацыяльных паслуг. На маю думку, было б справядліва, калі б людзі, якія не плацяць падаткі, адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны, набывалі такія карткі, каб, напрыклад, трапіць на прыём да ўрача. Пакуль жа ніякія рашэнні па ўвядзенні падатку на дармаедаў не прымаліся і ў бюджэце на 2014 год ён ніяк не адлюстраваны».

## $3,2 МЛРД ПА ДЗЯРЖДОЎГУ НАЛЕТА

«Вынік ацэнкі Сусветным банкам патрэбы эканомікі Беларусі ў знешнім фінансаванні —- 8 млрд долараў. Пакрываць гэтую патрэбу толькі за кошт дзяржаўных запазычанняў у прынцыпе немагчыма. А што тычыцца плацяжоў па знешнім дзяржаўным доўгу, то налета яны складуць 3,2 млрд долараў, — заявіў Уладзімір Амарын. — Для гэтага мы плануем прыцягваць як знешнія, так і ўнутраныя пазыкі ў замежнай валюце. У прыватнасці, на знешнім рынку збіраемся прыцягнуць каля 800 млн за кошт чарговага выпуску еўраабліraцый. Як вядома, першы такі выпуск быў ажыццёўлены ў 2010 годзе, другі — у 2011-м. У цэлым атрымалася прыцягнуць 1,8 млрд долараў. Мы прагназуем, што зможам выйсці на рынак альбо ў канцы першага паўгоддзя 2014 года, дзесьці ў маі, альбо ў другім паўгоддзі — у верасні-кастрычніку. Арганізатарамі выпуску еўрабондаў будуць «Ашчадны банк Расіі» і Банк ВТБ. Стаўка па еўраабліraцыях будзе сучасным трэндам: так, даходнасць па пяцігадовых еўрабондах складае 8,5%, па сямігадовых — 8,75%». Акрамя таго, Мінфін і надалей будзе прыцягваць на ўнутраным рынку сродкі фізічных і юрыдычных асоб, перш за ўсё банкаў. «Сёлета за кошт дзяржаўных валютных аблігацый мы атрымалі каля 900 млн долараў, з іх прыкладна 100 млн удалося прыцягнуць за кошт трох выпускаў аблігацый для фізічных асоб. 16 снежня мы ажыццявілі яшчэ тры выпускі дзяржаблігацый для фізічных асоб на агульную суму 50 млн долараў тэрмінам на 1 год пад 7% гадавых. Паводле нашых ацэнак, за першы тыдзень іх размяшчэнне сярод насельніцтва вядзецца даволі паспяхова (ужо на суму каля $ 10 млн). Я думаю, што ў першым паўгоддзі 2014-га мы будзем выходзіць яшчэ з адным выпускам аблігацый у замежнай валюце для фізічных асоб. У цэлым налета мы будзем ставіць перад сабой задачу па прыцягненні ад аблігацый для фізічных асоб 75-100 млн долараў». Чыноўнік таксама паведаміў пра тое, што працягваюцца перамовы з кітайскім бокам па прыцягненні крэдытных сродкаў на інвестыцыйныя мэты, у тым ліку для рэалізацыі імпартазамяшчальных і экспартаарыентаваных праектаў. «Многія з такіх праектаў ужо ажыццяўляюцца ў энергетыцы, дарожным будаўніцтве. Актыўна працягваецца праца з кітайскімі банкамі, перш за ўсё з Эксімбанкам Кітая, Банкам развіцця Кітая. У 2013 годзе мы ўключылі ў гэтую працу яшчэ адзін кітайскі банк, з якім пачынаем рэалізацыю аднаго з праектаў па фінансаванні аб'ектаў у энергетыцы».

## КРЭДЫТ ДЛЯ АЭС

«Назіральны савет расійскага Знешэканамбанка 19 снежня прыняў рашэнне аб адкрыцці ўраду Беларусі крэдытнай лініі на суму да 500 млн долараў для фінансавання часткі авансавых плацяжоў па праекце будаўніцтва Беларускай АЭС. Мы доўга гэты крэдыт прапрацоўвалі, рашэнне прынята, і цяпер эксперты працуюць над умовамі і ў цэлым па крэдытным дагаворы. Прыкладна да канца студзеня — пачатку лютага мы зможам гэты крэдыт аформіць і пачаць яго засваенне», — лічыць Уладзімір Амарын.

## КОЛЬКІ БУДЗЕ КАШТАВАЦЬ ЧС ПА ХАКЕІ?

Уладзімір Амарын не даў дакладнага адказу на гэтае пытанне: «На падрыхтоўку да чэмпіянату свету па хакеі, які будзе праходзіць у Мінску ў маі 2014 года, сродкі выдаткоўваліся з бюджэту горада. У першую чаргу яны накіроўваліся на тое, каб палепшыць дарожную інфраструктуру. Тут хацелася б звярнуць увагу, што пабудаваныя аб'екты застануцца для ўсіх жыхароў горада. Мы будзем карыстацца гэтымі дарогамі. Што тычыцца гасцініц, то яны ў асноўным будуюцца за кошт сродкаў інвестараў. Таксама пабудаваны аб'екты ў студэнцкай вёсцы, якія будуць выкарыстоўвацца для размяшчэння гасцей чэмпіянату. Потым імі будуць карыстацца нашы студэнты. Пабудаванай «Чыжоўка-Арэнай» будуць карыстацца жыхары, там будуць адпачываць дзеці, трэніравацца спартсмены. Гэта толькі на карысць нашаму гораду. Як і пасля любога мерапрыемства падобнага кшталту, пасля чэмпіянату свету па хакеі застанецца шэраг спартыўных аб'ектаў, камфортных гасцініц, месцаў размяшчэння, якімі потым мы будзем яшчэ вельмі доўга карыстацца. Казаць пра лічбы цяпер вельмі складана, але мы спадзяёмся, што падчас правядзення чэмпіянату, паколькі павялічыцца прыток турыстаў, павялічыцца тавараабарот, за кошт чаго будзе папаўняцца не толькі бюджэт горада, але і бюджэт краіны».

## «ВЫПРАБАВАЛЬНЫ ТЭРМІН» ДЛЯ АКЦЫЙ

На думку чыноўніка, рэфармаванне рынку каштоўных папер ідзе планамерна і паслядоўна. «Распрацаваны праект закона «Аб рынку каштоўных папер». Ён унесены ў парламент і прайшоў разгляд адпаведнай камісіяй у Палаце прадстаўнікоў. Новы закон будзе прымацца ўзамен дзейных законаў «Аб рынку каштоўных папер» і «Аб дэпазітарнай дзейнасці». Мы таксама падрыхтавалі закон «Аб інвестыцыйных фондах», зараз ён знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе. Гэты дакумент вельмі важны для рынку каштоўных папер. Літаральна ў бліжэйшы час ён павінен быць падпісаны.

Адным з элементаў рэфармавання можна назваць праект указа «Аб выпуску і абарачэнні замежных дэпазітарных распісак». Гэты ўказ доўгі час разглядаўся, цяпер ён падрыхтаваны, і мы спадзяёмся, што ў бліжэйшы час ён будзе прыняты. Закон створыць прававую базу, аснову для таго, каб акцыі нашых акцыянерных таварыстваў маглі прадавацца на знешніх рынках з выкарыстаннем такога інструмента, як дэпазітарныя распіскі. Гэты інструмент больш даступны для знешніх інвестараў, больш зразумелы для іх, і таму мы спадзяёмся, што ён прынясе пэўныя вынікі. Перавагай гэтага спосабу стане размяшчэнне беларускіх каштоўных папер, акцый на пэўны тэрмін — 2 гады. Новы ўладальнік акцый беларускага прадпрыемства на працягу двух гадоў будзе ўдзельнічаць у кіраванні акцыянерным таварыствам, атрымліваць адпаведныя дывідэнды, а па заканчэнні гэтага часу зможа прыняць рашэнне аб канчатковым выкупе акцый альбо іх продажы».

**Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



■ Глядзіце!

# ПА СТАРОНКАХ НАВАГОДНЯГА «ТЭЛЕМЕНЮ»

**Беларускія тэлеканалы, застаўшыся вернымі сабе, у святочную ноч будуць «частаваць» гледачоў разнастайнай музыкай і фільмамі, пераважна ў жанры камедыі. Хто якія ласункі прыгатаваў? Прапануем вашай увазе «фірменныя стравы» кожнага з каналаў.**

### Кінаманам на закуску



На тэлеканале «Беларусь 1» вырашылі не рыхтаваць адмысловых музычна-забаўляльных праектаў, а скарыстаць «залаты запас» тэматычнага кіно. З 25 снежня тут пачаліся кінаканікулы — паказ найбольш рэйтынгавых калядных і навагодніх фільмаў, прычым у самы зручны для гледачоў час. А 1 студзеня адразу пасля бою курантаў у рэжыме нон-стоп пакажуць тры кінастужкі: «З Новым годам, мамы!», «Іронія лёсу. Працяг» і «Карнавальная ноч-2», якія ўвайшлі ў топ-3 глядацкага галасавання ў акцыі «Народны хіт».

Таксама кожны дзень усімі любімы серыял «Сваты» набліжае нас да Новага года. Дзве заключныя серыі святочнай тэматыкі выйдуць у эфір вечарам 31 снежня. Не абыдзецца ў апошні дзень 2013 года і без паказу «фаварыта» некалькіх пакаленняў фільма «Іронія лёсу, ці З лёгкай парай!». Яго пакажуць перад выпускам інфармацыйнага канала «Панарама».

### Гарачае пад караоке



Тэлеканал «Беларусь 2», акрамя традыцыйнага і вельмі насычанага кінапаказу, 31 снежня чакае каля экранаў аматараў караоке. У праграму «Імперыя песні» завітаюць «зоркі» беларускай эстрады, каб выканаць свае самыя вядомыя і любімыя кампазіцыі.

— Ведаеце, сёння вельмі складана здзівіць некага ў навагоднюю ноч. Таму мы не імкнуліся да нечага неверагоднага, а вырашылі запрасіць у госці нашых артыстаў, якіх любяць нашы тэлегледачы. Мы адабралі тыя песні, якія на слыху ў аўдыторыі, бо яны часта гучалі на розных сцэнічных пляцоўках — падзяліўся вядучы народнага караоке-шоу Дзмітрый Карась. — Мы вырашылі не адыходзіць ад фармату нашай праграмы, таму ў гледачоў будзе магчымасць спяваць разам з любімымі артыстамі, седзячы за навагоднім сталом.

Сярод «зорнага» складу ў гэты раз можна будзе ўбачыць Аляксандра Ільевіча (пераможца праекта «Імперыя песні-1»), гурты «Паладзіум», «Песняры», «Не БоЯн style». Парадуюць сваімі хітамі Дарыя, Іна Афанасьева, Анастасія Ціхановіч, Алена Ланская, Арцём Міхаленка і многія іншыя. Для зручнасці тэлегледачоў тэксты песень, як заведзена ў караоке, будуць ісці «бягучым радком».

Навагоднімі жартамі будуць уздымаць настрой нязменны вядучы «Імперыі песні» Дзмітрый Карась разам з Дзедам Марозам і Снягуркай (у абодвух амплуа выступіць Віталь Карпанаў). Навагоднюю ноч яны правядуць за рэжысёрскім пультам.

### Бабуліны прысмакі ды прыпеўкі

У свой першы Новы год тэлеканал «Беларусь 3» прэзентуе ўнікальны праект — «100 песень для Беларусі. Наперад у мінулае». Канцэрт — вынік супрацоўніцтва аўтараў праграмы «Наперад у мінулае» і Моладзевага тэатра эстрады. Гледачоў парадуюць выкананнем народных песень у сучаснай апрацоўцы калектывы з усіх куткоў нашай краіны. Юбілейны канцэрт стане сотым выпускам арыгінальнага праекта Белтэлерадыёкампаніі «Наперад у мінулае». На працягу двух гадоў здымачная група шукала народныя песні па ўсёй Беларусі, а потым вялася праца над іх новым гучаннем. Колькасць сабраных песень за час існавання праграмы дасягнула запаветнай сотні. У канцэрт, зразумела, увайшло значна менш: прагучаць толькі найлепшыя музычныя кампазіцыі. А канцэпцыю яго — «калядаванне» — вызначылі беларускія абрады, звязаныя са святкаваннем Раства і Новага года.



— Многія людзі навагоднія канцэрты ўспрымаюць як гукавы фон для гаспадынь. Але ў нас зусім іншы фармат, мы падышлі да падачы праграмы з новага ракурсу, зрабілі акцэнт на народнай музыцы ў сучаснай апрацоўцы, — расказвае вядучая канцэрта Аксана Вечар. — У артыстаў настрой быў працоўны, бо на святы ўсе яны запатрабаваны. Асаблівае захапленне выклікалі тры фальклорныя калектывы, якія мы запрасілі паўдзельнічаць у праграме. Для іх тэлевізійныя здымкі — справа не са звыклых, але яны былі на ўзроўні.

... Да песенных калектываў з глыбінкі завітаюць «госці»: Гюнеш, Аляксей Хлястоў, Вольга Плотнікава, Іна Афанасьева, Саша Нэма і многія іншыя. Акрамя таго прагучаць дуэтныя кампазіцыі ў выкананні фальклорных калектываў і прафесійных спевакоў.

### Хакей з шампанскім

Старыя добры «Блакітны агеньчык» на новы лад падрыхтаваў для гледачоў тэлеканал АНТ. Папулярныя артысты — Георгій Калдун, Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Ганна Шаркунова, Ірына Дарафеева, Алена Ланская, гурты «Топлес» і «Cherry Lady», Дзядзька Ваня, «Лепрыконсы», а таксама ўдзельнікі праектаў «Акадэмія талентаў» і «Я спяваю» — аб'ядналіся ў дуэты, каб выка-



наць добра знаёмыя хіты, як беларускія, так і сусветныя, у сучаснай апрацоўцы. Знакамітая песня «Касіў Ясь канюшыну», напрыклад, прагучыць не толькі ў сучаснай аранжыроўцы, але і на англійскай мове.

А каб жыццё артыстам мёдам не падавалася, а гледачы дакладна не пераблыталі праграму з канцэртам на каналах-канкурэнтах, выканаўцы... нацягнулі канькі і выйшлі на лёд, каб згуляць у хакей. Прайшлі, так бы мовіць, баявое хрышчэнне напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі-2014. А кампанію беларускім артыстам склалі спецыяльныя госці, імёны якіх на канале традыцыйна трымаюць у сакрэце. «Зразумела, сур'ёзных спартыўных баталій не адбывалася, — заўважаюць прадзюсары АНТ. — У нас перамогуць сяброўства і добры настрой».

### Смяшынка на дэсерт

Зоркай перадсвяточнага эфіру тэлеканала СТБ стане вядучы Антон Мартыненка, які запрашае сустрэцца «На тым жа месцы, у той жа час» — а 22 гадзіне 31 снежня. Гасцямі спецвыпуску гэтага праекта выступяць... правільна, беларускія артысты Іна Афанасьева, Ганна Шаркунова, гурт «Тяни-Толкай», а таксама гурт «Самацветы» і адзін з расійскіх «фабрыкантаў» Прохар Шаляпін. Абяцаюць шмат спяваць і жартаваць.

Але, безумоўна, значна лепш з гэтай задачай справяцца гульцы КВЗ — аматараў добрага і разнастайнага гумару ў першыя хвіліны Новага года парадуюць удзельнікі Першай лігі КВЗ — каманды «Днепр», «Зборная СНД па вольнай барацьбе», «Зборная БДУ» і «Зборная Камызякскага краю па КВЗ».

Працягне навагоднюю ноч на СТБ традыцыйная тэледыскатэка «Хіты 80-х—90-х». А тыя, у каго яшчэ застануцца сілы і жаданне спяваць нават 1 студзеня, змогуць падпяваць 10 рознакаліберным аматарскім хорам з усёй краіны — удзельнікам навагодняга выпуску «Харашоу».

**Алена ДРАПКО, Вікторыя ЦЕЛЯШУК**



Фота прадстаўлена прэс-службамі тэлеканалаў.

■ Слухаць сваіх

## ЛАРЫСА ГРЫБАЛЁВА ПАПРАСІЛА ЯЕ НЕ КРЫЎДЗІЦЬ

**Прынамсі, так спявачка назвала свой новы альбом — «Не крыўдзь мяне». Усяго другі за час кар'еры. «Такое са мной здараецца рэдка — раз на 10 гадоў, — жартавала сама з сябе артыстка. — Мабыць, я настолькі ўжывалася спачатку ў ролю мамы, а потым у развіццё свайго бізнес-праекта, што многія паспелі забыцца, хто такая Ларыса Грыбалёва. Калі шчыра, я за гэты час пасталела, перагледзела многія прыярытэты і цяпер выпускам альбома падвожу пэўныя вынікі гэтага перыяду жыцця».**



Альбом, названы па лепшай песні мінулага года (паводле Нацыянальнай музычнай прэміі-2012), змяшчае 13 кампазіцый, сярод якіх як добра знаёмыя слухачам «Наўздагад», «Гадзінічкі», так і зусім новая «Да заўтра» — першая і пакуль што адзіная песня, словы і музыку да якой напісала сама Ларыса.

— 10 гадоў таму, калі ўбачыў свет ваш першы дыск, для беларускіх выканаўцаў гэта сапраўды было важна — паказаць напрацоўкі, раскруціцца на радыё, прадаць як мага больш альбомаў у музычных крамах. Цяпер жа часта яшчэ да выхаду альбома яго слухаюць і спампоўваюць з інтэрнэту. Дык ці ёсць сэнс яго наогул выдаваць?

— Я сама шмат думала над гэтым, — прызналася спявачка, — і вырашыла ўсё ж выдаць. Больш за тое, асноўную частку матэрыялу запісала ў студыі ў горадзе Цвер, дзе запісваюцца папулярныя расійскія артысты, бо для мяне ўсё важна рабіць якасна. А вось афармленне альбома наўмысна абрала мінімалістычнае. Нават адмысловую фотасесію не рабіла, а назва і спіс песень зроблены ад рукі — з чарнавіка праграмы, які я запісвала практычна на сурвэтцы, алоўкам для вачэй. І тыраж у альбома невялікі, бо гэта не пласцінка «для галачкі». Яна прызначана для тых, каму сапраўды патрэбна, — для маіх сяброў і адданых слухачоў.

На прэзентацыю альбома, якая прайшла «жыўцом» у адным са сталічных клубаў, завіталі не толькі калегі і сябры Грыбалёвай па сцэне, але таксама сям'я спявачкі — бацькі, муж і дзеці, Аліса і Арсеній, якім у парадку выключэння дазволілі прысутнічаць на канцэрце з пачатку да канца і легчы спаць позна. Сама ж спявачка мімаходзь прызналася, што можа нагадаць аб сабе яшчэ і ў якасці тэлевядучай: цяпер ідуць перамовы наконт выпуску ў новым фармаце праграмы «Усё нармальна, мама!».

## ГЮНЕШ АБАСАВА ЎЗЯЛА «СЕРАБРО» НА «ТУРЭЦКІМ ЕЎРАБАЧАННІ»

**Нездарма дзеля выступлення на першым міжнародным конкурсе «Turkvision», што прайшоў днямі ў турэцкім горадзе Эскішэхір, спявачка адклала на некалькі месяцаў выпуск альбома і нават уласнае вяселле. Прадстаўніца Беларусі, абышоўшы сапернікаў з больш як 20 еўразійскіх краін, заняла ў творчым спаборніцтве другое прызавое месца. Прычым ад пераможцы, прадстаўніка Азербайджана Фарыда Гасанава, яе аддзялялі ў выніку ўсяго 5 балаў — 205 супраць 210! Трэцяе месца з 200 баламі заняла канкурсантка з Украіны Фазіля Ібрагімава.**



Конкурс «Turkvision», які многія параўноўваюць з «раскручаным» фарматам «Еўрабачання», пры вонкавым падабенстве мае і пэўныя адметнасці. Так, удзельнічаць у ім могуць толькі песні на цюркскіх мовах (Гюнеш выконвала баладу ўласнага сачынення «Son hatiralar...» — «Апошнія ўспаміны»), а наступны конкурс, незалежна ад таго, прадстаўнік якой краіны займе першую прыступку п'едэстала, павінен адбыцца ў сталіцы цюркскага свету — у 2014 годзе гэту пачэсную ролю выканае Казань. Акрамя таго, выканаўцы спаборнічаюць не толькі за дыплом пераможцы, але і за цалкам матэрыяльныя ўзнагароды: уладальнік 1-га месца атрымлівае 20 тысяч еўра і 150-грамовую залатую статуэтку — сімвал конкурсу, уладальнікі 2-га і 3-га месцаў — па 10 тысяч еўра. У дадатак, паводле слоў генеральнага дырэктара «Turkvision-2013» Ісмета Заатава, для прызёраў плануецца зняць відэакліпы і запісаць альбомы, а ў некаторых краінах, удзельніцах конкурсу, правесці зборныя канцэрты.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Медыяпрастора

## НАВАГОДНЯЯ НОЧ З РАДЫЁ «МІР»

**Апошнія хвіліны перад Новым годам — гэта заўсёды мітусня. Трэба многае паспець: накрыць стол, прыгатаваць салаты і святочны пірог, прыбрацца, сустрэць гасцей. І галоўнае — загадаць самае патаемнае жаданне... Радыё «Мір» дапаможа вам успомніць тое прыемнае, што адбылося з вамі ў 2013 годзе. А паколькі ўся навагодняя падрыхтоўка ляжыць, у асноўным, на жаночых плячах — пачатак навагодняга вечара на радыё будзе прысвечаны менавіта жанчынам.**

МИР

| | |
|---|---|
| Брэст | 106.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM |
| Мінск | 107.1 FM |
| Гродна | 104.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM |
| Бабруйск | 103.6 FM |
| Баранавічы | 98.4 FM |
| Салігорск | 104.3 FM |
| Пінск | 103.2 FM |

У апошнія гадзіны адыходзячага года Ірына Пятровіч у святочным выпуску праграмы «Мадам» раскажа шмат цікавага пра людзей і падзеі, якія пакінулі сёлета яркі след. Пра незвычайныя і забаўныя здарэнні, пра жанчын, якія нас здзівілі, пра тое, што нас чакае ў наступным годзе і якія загадаць жаданні, каб Новы год правесці ў добрым настроі.

У 22 гадзіны Каця Іўліева прапануе слухачам нашага радыё ўспомніць лепшыя хіты — 2013. І, вядома, патанцаваць — аж да трох ночы. Вы зможаце пачуць самыя яркія, вядомыя, любімыя і незабыўныя хіты з усяго свету ў танцавальным праекце «Міравая пляцоўка». А пасля, калі дагараць усе бенгальскія агні, адгрымяць феерверкі, будзе запушчаны ў неба апошні кітайскі ліхтарык і загаданы ўсе жаданні, — можна ўхутацца ў цёплы плед і, седзячы каля каміна, паслухаць прыгожую музыку, каб акунуцца ў чароўную атмасферу Новага года і трохі памарыць.

Сустрэнем Новы год разам з радыё «Мір»!

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

**Заканчваецца падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2014 года!**

**Шаноўныя сябры!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «Інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым калядным падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы | 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 | 285 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 | 256 500 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 | 571 800 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 | 514 800 |


# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 30 СНЕЖНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.10** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00 Камедыя «Яды, або Сусветная гісторыя атручэнняў».**
**12.10, 14.55** Eurovision. Без каментарыяў.
**12.15** Лёс гігантаў.
**13.20 Серыял «Сваты-6. За кадрам». «Рэканструкцыя».**
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра — гэта мы!
**16.25** Усё як трэба!
**16.50 Меладрама «Шукайце маму».**
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Сваты-6».**
**22.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.45** Дзень спорту.
**0.00 Трылер «Хелбой: Герой з пекла».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45** Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
**11.45 Камедыя «Зімовы вечар у Гаграх».**
**13.30** Тэніс. Брысбен. Жанчыны.
**15.55 Баявік «Разборкі ў стылі кунг-фу».**
**18.55 Камедыя «Вядзьмарка».**
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Інтэрны».**
**22.40 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**23.30 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабранак».
**8.00, 12.15, 19.05, 23.55** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.20, 0.00** «Год у гісторыі».
**8.20** «Пейзажы скрозь час». Пейзажы Джона Фрэдэрыка Кэнсэта.
**8.55** «Скарбніца Міншчыны». Архітэктурныя помнікі Мядзельшчыны.
**9.20** «Палескі пачастунак». Медавуха-вішняк.
**9.35, 20.50 Серыял «Майстар і Маргарыта».**
**10.25, 21.35** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.55 «Белеет парус одинокий...». Маст. фільм.**
**12.35, 23.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці Андрэя Макаёнка.
**13.00, 23.00** «Аўтограф».
**13.35** «Востраў». Дак. фільм.
**13.55** «Пясняр Нарачанскага краю». Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Максіма Танка.
**14.20** «Таямніца душы». Гродзенская семінарыя.
**14.50** «Карані».
**15.15** «Навагодні тыдзень». Вечар з Мікалаем Гнацюком.
**16.10** «Наперад у мінулае».
**16.35** «Анёл на мачце». Дак. фільм.
**17.00** «Музеум».
**17.20** «Майстры і чаляднікі».
**17.45** «Краіна лясоў і азёраў». Дак. фільм.
**18.00** «Полета вольное упорство». Дак. фільм.
**18.35** «А музыка гучыць...». Канцэрт салістаў Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча.
**19.15 Дзіцячы фільм. «Каралеўства Крывых Люстэркаў».**
**20.30** Калыханка.
**22.05** «Навагодні тыдзень». Вечар з ВІА «Синяя птица».

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.30** Тэніс. Турнір ВТА.
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Чэлсі» — «Ліверпуль».
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Эвертан» — «Саўтгемптон».
**18.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ЦСКА — «Нептунас».
**19.50** Авертайм.
**20.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Сток Сіці».
**22.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.00** Хакей для ўсіх.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Камедыя «Прывітанне, я ваша цётка!».**
**13.10** «Добрага здароўечка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Гандаль па-савецку. «Дастаць», калі «выкінуць».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** Канцэрт групы «Акіян Эльзы».
**23.30 Камедыя «Д'ябал носіць Prada».**
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40 Серыял «Жаданая». Заключная серыя.**
**11.35** «Такі лёс».
**12.20** «Глядзець усім!».
**12.50** «Вялікі горад».
**13.50** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.10** «Іншая краіна». «Сінгапур. «З гразі ў князі».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Глядзець усім!».
**17.30** «Правілы маёй кухні».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** Фінал Першай лігі Міжнароднага саюза КВЗ.
**23.00** «Хуліган. Споведзь». Сяргей Бязрукаў.
**0.40 Серыял «Знахар: Паляванне без правіл». Заключныя серыі.**

### МІР

**5.00, 4.15** М/ф.
**7.30 Маст. фільм «Мама».**
**9.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**9.10 Маст. фільм «Тры жаніхі».**
**9.25 Маст. фільм «Запасное кола».**
**9.30 Маст. фільм «Суботні вечар».**
**9.50 Маст. фільм «Тры рублі».**
**10.05 Маст. фільм «Лімонны торт».**
**10.25 Маст. фільм «В. Давыдаў і Галіяф».**
**11.15** «Разам».
**12.25 Серыял «Клон».**
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.20** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.20 Серыял «Спадчына».**
**18.25 Маст. фільм «32-га снежня».**
**20.05** Вялікая Навагодняя дыскатэка.
**21.55 Маст. фільм «Эмігрант».**
**0.00 Маст. фільм «Віват, Гардэмарыны!».**
**2.25 Маст. фільм «Гардэмарыны 3».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Шынок краіны Саветаў».
**12.55, 14.25 Маст. фільм «Бесталковая нявестка».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.30** Навіны — Беларусь.
**17.00** «Смяяцца дазваляецца».
**18.05 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».**
**20.40 Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-2».**
**22.40 Маст. фільм «Адзінокія сэрцы».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Гаруноў».**
**23.10** Сёння. Вынікі.
**23.35 Маст. фільм «Шокавая тэрапія».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.50, 18.55, 21.00, 23.20** «Надвор'е».
**7.05, 14.10 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**8.45, 17.25 Серыял «Касл».**
**10.15 Камедыя «Чарадзеі».**
**12.55, 15.45** Мультпарад.
**16.00** «Мой любімы гадаванец».
**16.30 Серыял «Гімнасткі».**
**19.00 Камедыя «Замуж на два дні».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Меладрама «Стары Новы год».**

### ВТБ

**6.00, 0.00** «PLAY».
**8.00, 14.00, 18.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30, 17.30** «С.У.П.».
**9.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.00 Серыял «Маргоша».**
**12.00, 21.10 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 16.30, 20.00** Скетч-шоу «Анекдоты».
**13.30, 17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.30, 23.30** «Улётнае відэа».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00, 18.30, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**19.00, 0.30 Серыял «Аднакласнікі».**
**19.30** «Вясёлыя гісторыі з жыцця».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.40, 18.30, 22.45** Навіны культуры.
**9.15** «Наглядальнік».
**10.15 «Звоняць, адчыніце дзверы». Маст. фільм.**
**11.30** «Больш, чым каханне». Ралан Быкаў і Алена Санаева.
**12.15** «Валагодскія матывы». Дак. фільм.
**12.25 «Снягурка». Маст. фільм.**
**13.55** «Любоў мая — эстрада». Дак. фільм.
**14.50 «Зігзаг удачы». Маст. фільм.**
**16.20** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.35** «Kremlin gala». Канцэрт зорак сусветнага балета XXI стагоддзя.
**18.45** Галоўная роля.
**19.15** «Саці. Нясумная класіка...». Навагодні выпуск.
**20.35** «Леанід Гайдай... і трохі пра «брыльянты». Дак. фільм.
**21.20** Гала-канцэрт у Бадэн-Бадэне.
**23.05 «Яшчэ раз пра каханне». Маст. фільм.**
**0.40** «Чаму смеяцеся? або Класікі жанру».
**1.45** П'есы для гітары.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час». 2008 год.
**6.00** «Пад знакам задыяка. Казярог». 1994 год.
**7.15** «Падаў леташні снег». М/ф.
**7.40** «Музыка ў эфіры». 1991 год.
**8.40** «Сатырычны прагноз». М. Задорнаў. 1992 год.
**9.00 «Снягурку выклікалі?». Маст. фільм.**
**10.10** «Мелодыі сяброў». Канцэрт.
**11.00** «50/50». 1992 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.05** «Котка на радыятары». Тэлеспектакль. 1977 год.
**14.00** «Кіно нашага дзяцінства». 1986 год.
**15.00** «Ранішняя пошта» ў гасцях у «Лесвіцы Якаба». 1988 год.
**17.00** «Грымучы тузін». Фільм-канцэрт.
**17.40** «Уладзімір Высоцкі. Песні, маналогі». Фільм-канцэрт.
**18.00** «Навагодняя тусоўка». 1991 год. 1 частка.
**18.40 «Смеханічныя прыгоды Тарапунькі і Штэпселя». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.45** «Калі ідзе снег...». 1963 год.
**20.00, 2.00** «Час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Навагодні атракцыён». Фільм-канцэрт. 1 частка.
**23.00** «Дзе там». 1993 год.
**23.45** «Бенефіс Савелія Крамарава». 1974 год.
**0.30** «Хто ёсць хто?». Тэлеспектакль. 1977 год.
**1.40** «Добрай ночы, малыя».
**4.00** «Кінапанарама». Навагодні выпуск. 1984 год. 1 частка.

### EUROSPORT

**10.30, 13.45, 20.15** Скачкі на лыжах. Турнэ 4-х трамплінаў.
**11.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**12.45, 19.15** Лыжныя гонкі. Тур дэ Скі.
**14.45** Біятлон. Калядная гонка.
**15.45, 1.30** Фігурнае катанне. Паказальныя выступленні.
**16.45, 22.00, 0.30, 3.00** Хакей. Кубак Шпенглера.
**20.00** Sport Excellence.
**21.55** Тэніс. Вяртанне Рафы.
**0.25** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе.
**1.10, 1.25** Спартыўны пашпарт.
**1.15** GTA. Наступны ўзровень.
*3.30 Тэхнічны перапынак.*

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 11.00, 16.40, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.20, 1.55** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**6.10, 0.15** Камедыя «Ідэальны мужчына».
**7.50, 3.00** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**9.30** Камедыя «Сабачая справа».
**11.20** Камедыя «Не блага б пахудзець».
**13.00, 21.55, 2.40** «Камедыянты. Лепшае».
**13.15** Камедыя «Не злоўлены — не злодзей».
**14.45** Камедыя «Філадэльфійская гісторыя».
**17.00** Камедыя «Паліцэйскі і малы».
**18.45** Камедыя «Брусель—ЗША».
**20.20** Камедыя «Удачы, Чак».
**22.10** Фэнтэзі «Чаго хочуць жанчыны?».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 2.55** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Ірына Лінт.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Яўген Грышкавец.
**15.15, 0.05** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.30** Серыял «М.У.Р». Заключныя серыі.
**22.20, 4.30** Серыял «Аперацыя «Гаргона». Заключныя серыі.
**0.55** Серыял «Быць чалавекам».
**2.00** «Часова даступны». Павел Санаеў.

### ТБ1000

**5.00, 13.10** Баявік «Чалавек-Павук 3».
**7.25** Фэнтэзі «Дом ля возера».
**9.15** Камедыя «З 13 у 30».
**11.00** Камедыя «Салодкі лістапад».
**15.35** М/ф «Труп нявесты».
**17.15** Камедыя «Джэк і Джыл: Каханне на чамаданах».
**19.00** Трылер «Тайнае акно».
**20.50** Трагікамедыя «Моцная жанчына».
**23.10** Камедыя «Без істэрыкі!».
**1.00** Камедыя «Слава».
**3.00** Меладрама «Спяшайся кахаць».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Трагікамедыя «Душка».
**8.05** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**9.35** Камедыя «Навагодні шлюб».
**11.30** Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі».
**14.10** Камедыя «Спартакіяда. Лакальнае пацяпленне».
**15.55** М/ф «Пра Фядота-стральца, удалага малайца».
**17.15** Драма «Мелодыя для катрынкі».
**20.00** Камедыя «Тарыф Навагодні».
**22.00** Камедыя «Дзед Мароз заўсёды звоніць... тройчы!».
**0.00** Камедыя «Ёлкі».
**2.00** Драма «Снежная каралева».
**4.00** Фэнтэзі «Залатая рыбка ў горадзе N».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 19.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**7.00** Тайнае логава акул.
**8.00, 13.00, 16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**9.00, 14.00** Злавіць сома.
**10.00, 12.00** Гульні розуму.
**11.00** Мегазаводы.
**15.00** Галівудскі мядзведзь-забойца.
**17.00, 2.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**18.00** Пакінутыя.
**18.30** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**20.00, 0.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 1.00, 4.00** Амерыканская мафія.
**22.00** Тайны гісторыі.
**23.00** Мяжа.

### DISCOVERY

**7.00** Паўночная Амерыка.
**7.50, 12.20, 3.05** Падарожжа ў экстрым.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 17.20** Каралі аўкцыёнаў.
**10.30, 0.00** Як устроены Сусвет.
**11.25, 3.55** Разбуральнікі легенд.
**13.15, 5.10** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**14.10, 6.05** Махінатары.
**15.05** Махінатары на трасе.
**15.30** Рыбацкія легенды.
**16.25** Смяротны ўлоў.
**18.15** Не спрабуйце паўтарыць.
**19.10** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**21.00** Эд Стафард: голае выжыванне.
**22.00** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.55** Top Gear.
**1.50** У турме і на чужыне.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## ПЯТНІЦА, 3 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.20, 23.50** Зона Х.
**9.10, 17.35 Серыял «Сэрца Марыі».**
**10.10 Маст. фільм «Мушкецёры».**
**12.10, 14.55** Eurovision. Без каментарыяў.
**12.15 Камедыя «Не можа быць!».**
**14.00** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30, 0.50 Серыял «Джамайка».**
**16.30** «Без права на дубль». Ігар Талькоў.
**19.55 Серыял «Такое звычайнае жыццё».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55 Трылер «Абрабаванне на Бейкер-Стрыт».**
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05 Фільм-казка «Навагоднія прыгоды Машы і Віці».**
**10.25 Камедыя «Паляўнічыя на прывідаў».**
**12.10 Камедыя «Паляўнічыя на прывідаў-2».**
**14.00** Тэніс. Брысбен. Жанчыны.
**16.10** Імперыя песні.
**17.10** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**19.00, 23.15** «Comedy woman».
**19.55** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.30** Рэпарцёр.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.20, 18.30, 0.35** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.25, 0.45** «Год у гісторыі».
**8.20** «Карані».
**8.50** «Пейзажы скрозь час».
**9.20** «Палескі пачастунак». Ячменны напой.
**9.35, 20.50 Серыял «Майстар і Маргарыта».**
**10.25, 21.40** «Сіла веры».
**10.50 «Тэкумзе». Маст. фільм.**
**12.40, 0.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці Івана Фяцісава.
**13.05, 23.40** «Містыка ўлады». «Пасля параду». Дак. фільм.
**13.35** «Зроблена!». Кінавытворчасць.
**14.00** «Ведай нашых!». Юлія Несцярэнка.
**14.15** «Майстры і чаляднікі».
**14.40** «Камертон». Яўген Еўтушэнка.
**15.15 «Масакра». Маст. фільм.**
**16.55** «Росчырк часу».
**17.05** «Лабірынты».
**17.35** «Цуды прыроды».
**18.00** «Рэчавы доказ». Шкляны жарт. Дак. фільм.
**18.35 «Джэйн Эйр». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**22.05 «Выбарчая роднасць». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.30, 12.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга.
**8.25, 13.25** Тэніс. Турнір ВТА. 1/2 фіналу.
**10.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Арсенал» — «Кардыф».
**15.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Суонсі» — «Манчэстэр Сіці».
**17.20** Біятлон. Хохфільцэн. Эстафета. Жанчыны.
**18.55** Хакей. Калядны турнір. Беларусь — Францыя.
**20.55** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны, жанчыны.
**23.50** Фактар сілы.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05 Прыгоды «След Сокала».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Фільм-казка «Марозка».**
**13.10** М/ф «Дванаццаць месяцаў».
**14.10 Камедыя «Адзін дома 2».**
**16.15** М/ф «Ледніковы перыяд 3: Эра дыназаўраў».
**18.20** М/ф «Ку! Кін-дза-дза».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Тры мушкецёры».**
**23.05 Маст. фільм «Моцны арэшак».**
**1.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**9.00** «Дэвід Коперфільд: каханне, шпіянаж і іншыя фокусы».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40 Маст. фільм «Карнавал».**
**13.50** «Прыгоды дылетанта».
**14.25 Маст. фільм «Маска».**
**16.50** «Далёкія сваякі».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Правілы маёй кухні».
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Вайна прыгажунь».**
**22.00, 23.00** «На тым жа месцы ў той жа час».
**23.55 Маст. фільм «Дрэнны Санта».**
**1.30** «Вялікая гульня». Покер-дуэль.

### МІР

**5.00** М/ф.
**7.40** М/ф «Астэрыкс у Брытаніі».
**9.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**9.10, 3.15 Маст. фільм «Жандар з Сен-Трапэ».**
**10.50 Маст. фільм «Формула кахання».**
**12.30** М/ф «Прыгоды капітана Врунгеля».
**13.00** Мюзікл «Марозка».
**15.10, 0.25 Серыял «Гаражы».**
**18.10 Серыял «Куля-Дурніца. Вяртанне агента».**
**21.20 Маст. фільм «Налева ад ліфта».**
**22.50** Цырк Дзю Салей.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Сабака на сене».**
**9.20 Маст. фільм «Берагі кахання».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.20, 14.10 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».**
**13.50, 16.15, 19.50, 22.10** Навіны — Беларусь.
**16.25 Маст. фільм «Тэрмінова патрабуецца Дзед Мароз».**
**18.00** «Ізмайлаўскі парк».
**20.25 Маст. фільм «Каралі».**
**22.20 Маст. фільм «След кахання».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Іх норавы».
**8.55** «З песні слоў не выкінеш!».
**10.20 Серыял «Урач».**
**13.20 Серыял «Настаўнік у законе. Працяг».**
**16.45 Маст. фільм «Каханне пад грыфам «Зусім сакрэтна».**
**18.35** «І зноў прывітанне!».
**19.25 Серыял «Аперацыя «Лялькавод».**
**22.55 Маст. фільм «Шпількі-3».**
**0.40** «Таямнічая Расія».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.00, 18.45, 21.00, 23.45** «Надвор'е».
**7.05, 14.00 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**8.45, 17.15 Серыял «Касл».**
**10.15, 18.50 Серыял «Рані».**
**12.05 Трылер «Місія невыканальная».**
**15.40** Мультпарад.
**15.50** «Адшукваецца адпачынак».
**16.20 Серыял «Гімнасткі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Трансформеры».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.30** «Наш Новы год!» Рамантычныя шасцідзясятыя. «Наш Новы год!» Душэўныя сямідзясятыя.
**12.30** Лядовае шоу «Залаты лёд Страдывары».
**14.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**15.00** «Зоркавы Новы год!».
**16.00 Меладрама «Зменлівасці кахання».**
**18.00, 0.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**19.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.00, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**21.00 «Маладзёжка». Фільм аб фільме.**
**22.15** «Добрыя жарты».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.20** «Наглядальнік». Вячаслаў Палунін і Веніямін Смехаў.
**10.15** «Снежнае шоу Вячаслава Палуніна».
**11.15** Знакамітыя інкогніта. «Вячаслаў Каляйчук. Майстар немагчымага».
**11.50, 0.55** «Афрыка». Дак. серыял.
**12.40** Дзіцячы сеанс. «Зачараваны хлопчык». «Дзюймовачка». М/ф.
**13.50** Лучана Павароці. Канцэрт.
**15.05** «Школа ў Новым Свеце». Дак. серыял.
**15.50** Да 95-годдзя Данііла Граніна. «Прамая гутарка. Пра літаратуру».
**16.25** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.40** «Марына Ладыніна». Дак. фільм.
**17.20 «Свінарка і пастух». Маст. фільм.**
**18.40** «Лінія жыцця». Аляксандр Разенбаўм.
**19.40** «Марачы пра сябе іншую. Марына Няёлава». Частка 2-я.
**20.10** «Іль Дзіва». Канцэрт.
**21.10 «Марыя — каралева Шатландыі». Маст. фільм.**
**23.15** Пол Анка. Канцэрт.
**0.15** «Вельмі сіняя барада». «32 снежня». М/ф.
**1.50** «Алена Блавацкая». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Клуб падарожнікаў». 1987/88 гг.
**6.10** «Віншаванні «Навагодняму агеньчыку». Канцэрт.
**6.40, 12.35 «Дом, які пабудаваў Свіфт». Маст. фільм.**
**8.00, 14.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 15.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.00, 4.10** «Навагодні атракцыён». Фільм-канцэрт.
**11.00** «Доміcолька». Навагодняе казачнае прадстаўленне для дзяцей. 1994 год.
**11.40** «Навагодні мультканцэрт». 1985 год.
**13.40** «Песні розных гадоў». Фільм-канцэрт.
**16.05** «Рытмы планеты». 1985 год.
**17.10** «Для вас, бацькі!». 1981 год.
**17.40** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**18.10** «Піф-паф ой-ой-ой». М/ф.
**18.30 «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Маст. фільм.**
**19.40** «Добрай ночы, малыя».
**21.00** «Колба часу».
**22.00** «Кінапанарама». Навагодні выпуск. 1984 год.
**23.00** «Свет сустракае Новы год». 1977 год.
**23.50** «Навагодняя тусоўка». 1991 год.
**0.30 «Смеханічныя прыгоды Тарапунькі і Штэпселя». Маст. фільм.**
**1.40** «Гэта было, было... Новы год». Фільм-канцэрт.
**3.00** «На дзве гадзіны раней». Фільм-канцэрт.

### EUROSPORT

**10.30, 2.30** Ралі-рэйд. Афрыка Эка Рэйс.
**10.40, 21.15** Тэніс. Вяртанне Рафы.
**10.45, 16.00, 19.00, 23.30** Скачкі на лыжах. Турнэ 4-х трамплінаў.
**11.45, 18.30** Лыжныя гонкі. Тур дэ Скі.
**17.00, 19.45, 0.30** Біятлон. Кубак свету.
**19.40, 23.25** Sport Excellence.
**21.15, 2.50** Тэніс. Турнір АТР.
**2.15** GTA. Наступны ўзровень.
**2.45** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе.
***3.30 — Тэхнічны перапынак.***

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 16.40, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.15** Камедыя «Прадаецца дача...».
**6.55** Камедыя «Вайна прыгажунь».
**8.25** Камедыя «Мы — легенды».
**10.10** Прыгоды «Эйс Вентура. Вышук свойскіх жывёл».
**11.35** Камедыя «Любоўь-морковь 2».
**13.15** Камедыя «Лары Краўн».
**15.00** Камедыя «Ёлкі».
**16.25** «Камедыянты. Лепшае».
**17.00** Камедыя «Ужо хто б казаў-3».
**18.50** Прыгоды «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода».
**20.20** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**22.10** Камедыя «Ёлкі 2».
**23.50** Камедыя «Норт».
**1.25** Камедыя «Выкрадзеныя сэрцы».
**3.00** Камедыя «Дзевяць ярдаў 2».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.15, 14.45** «Доктар І..».
**8.45, 18.30, 2.45** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.30, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.30, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.30, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.00** Серыял «М.У.Р». Заключныя серыі.
**15.15, 0.50** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.20** Камедыя «100 мільёнаў еўра».
**22.10** Маст. фільм «Пункт прызначэння».
**0.00** Серыял «Падмані мяне».
**2.15** «Новы год. Погляд у мінулае».
**4.20** «Пункт прызначэння».

### ТБ1000

**5.00** Камедыя «Разумнікі».
**6.55, 13.00** Баявік «Каралі Дагтаўна».
**8.55** Трагікамедыя «Вундэркінды».
**10.55** Камедыя «Патрыманыя львы».
**15.00** Фантастыка «Зыходны код».
**16.40** Баявік «Чалавек-павук».
**19.10** М/ф «Гнамеа і Джульета».
**21.00** Драма «Трымай рытм».
**23.10** Драма «Небяспечны метад».
**1.00** Камедыя «Сімона».
**3.10** Меладрама «Штосьці новенькае».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Меладрама «8 першых спатканняў».
**8.00** М/ф «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч».
**10.00** Мюзікл «Снягурка».
**12.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
**14.00** Камедыя «Са мной вось што адбываецца».
**16.00** М/ф «Карлік Нос».
**18.00** Меладрама «Мамы».
**20.00** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**22.00** Камедыя «Скарбы О.К.».
**0.00** Меладрама «Галубка».
**2.00** Камедыя «Асаблівасці нацыянальнай палітыкі».
**4.00** Дэтэктыў «Сіняя барада».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 21.00, 1.00, 4.00** Злавіць сома.
**6.00, 15.00, 19.00, 0.00, 3.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**7.00** Кракадзілы Катумы.
**8.00, 12.00** Аферысты і турысты.
**10.00** Дзіўнае побач.
**11.00** Скарбашукальнікі.
**14.00** У вялікім краі Серэнгеці.
**16.00, 2.00** Грашовае сховішча ЗША.
**17.00** Мегазаводы.
**18.00** Пакінутыя.
**18.30** Рабі стаўкі і ўзрывай.
**22.00** Замак: перажыць Армагедон.
**23.00** У пагоні за НЛА.

### DISCOVERY

**7.00** У пагоні за класікай.
**7.50, 13.15** Хлопцы з Юкана.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Брудныя грошы.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Як устроены Сусвет.
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.25** Майстры выжывання.
**17.20, 3.05** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**18.15** Залатая ліхаманка.
**21.00** Пяцёрка лепшых.
**22.00** Цуды Сусвету.
**23.00** Як устроена Зямля.
**0.00, 5.10** Навука магіі.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## СУБОТА, 4 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.05** Існасць.
**7.30 Камедыя «Службовы раман». 1-я серыя.**
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** Зямельнае пытанне.
**9.35, 23.30 Меладрама «Час кахаць». 1-я і 2-я серыі.**
**11.30, 16.35** Давярай і правярай.
**12.10** Здароўе.
**13.00 Маст. фільмы «Сабака Барбос і незвычайны крос», «Самагоншчыкі».**
**13.35** Нашы.
**13.50** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Без права на дубль». Ігар Талькоў.
**17.05** Гісторыя «Славянскага базара».
**18.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**19.10 Меладрама «Час шчасця».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «50 першых пацалункаў».**
**23.20** Дзень спорту.
**19.50** Ваша лато.
**20.35** Латарэя «Пяцёрачка».
**21.00** КЕНО.
**21.05 Прыгоды «Гісторыя рыцара».**
**23.20** Вышэй за дах.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.15 Фільм-казка «Агонь, вада і... медныя трубы».**
**8.40, 20.55** Тэлебарометр.
**8.45** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**9.55** Беларуская кухня.
**10.35 Баявік «Людзі ў чорным».**
**12.25** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.25, 23.55 Серыял «Таксі».**
**14.25** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Мужчыны.
**15.20** Тэніс. Брысбен. Фінал. Жанчыны.
**17.30** «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне».
**18.00** «Comedy woman».
**18.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Жанчыны.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.40, 19.00, 0.30** «Калейдаскоп».
**8.05, 12.50, 0.35** «Год у гісторыі».
**8.20** «Цуды прыроды».
**8.55** «Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі — смелы прапаведнік імя Хрыстова». Дак. фільм.
**9.20** «Сямейны альбом». Сям'я Карачун.
**9.35, 20.50 Серыял «Майстар і Маргарыта».**
**10.25** «Свет прыроды».
**10.50 «Джэйн Эйр». Маст. фільм.**
**13.05, 0.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці Юрыя Цырука.
**13.30, 23.35** «Містыка ўлады». «Імператарскі асяродак». Дак. фільм.
**14.00 «Мы — хлопцы жывучыя». Маст. фільм.**
**15.20 «Выбарчая роднасць». Маст. фільм.**
**16.55** «Скарбніца Гомельшчыны».
**17.20** «Камертон». Любоў Казарноўская.
**17.45** «Палескі пачастунак». Саламаха.
**18.00** «Карані».
**18.35** «Лабірынты». Архітэктар Лявон Вітан-Дубейкаўскі.
**19.10 «Музычная гісторыя». Маст. фільм.**
**20.30** Калыханка.
**21.45 «Рымская вясна місіс Стоўн». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.00, 11.25** Фактар сілы.
**8.30** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны, жанчыны.
**11.55** Тэніс. Турнір ВТА. Фінал.
**13.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Чэлсі» — «Ліверпуль».
**15.50** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
**18.10, 20.55** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). 1/2 фіналу.
**20.00** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Мужчыны.
**23.15** Хакей. Калядны турнір. Славакія — Беларусь.
**0.55** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Прыгоды «Апачы».**
**10.50 Маст. фільм «Гусарская балада».**
**12.55** «Брэйн-рынг».
**14.00 Прыгоды «Раман з каменем».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** М/ф «Ледніковы перыяд 2: Глабальнае пацяпленне».
**17.55** Ералаш.
**18.15** «Адгадай мелодыю».
**18.45 Камедыя «Zолушка».**
**21.05 Серыял «Тры мушкецёры».**
**23.05 Маст. фільм «Моцны арэшак 2».**
**1.15 Камедыя «Джэнтльмены аддаюць перавагу бландзінкам».**

### СТБ

**6.00 Маст. фільм «Дон Сезар дэ Базан».**
**8.25 Камедыя «Вайна прыгажунь».**
**10.00** «Дзень касмічных гісторый». «Пікнік на абочыне».
**10.55** «Дзень касмічных гісторый». «Архітэктары старажытных планет».
**11.50** «Прыгоды дылетанта».
**12.25 Маст. фільм «Салодкая жанчына».**
**14.10** «Дзень касмічных гісторый». «Захавальнікі зорнай брамы».
**15.05** «Дзень касмічных гісторый». «Месяцавая гонка».
**16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Вялікі горад».
**17.25** «Далёкія сваякі».
**17.40** «Загадкі Сусвету»: «Паляўнічыя на скарбы».
**18.40** «Разумней не прыдумаеш».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Фантастыка «Матрыца».**
**22.45** «Зорны рынг»: удзельнікі праекта «Гарады, якія спяваюць».
**0.00** «Дыскатэка 80—90-х».

### МІР

**5.00** М/ф.
**7.35** М/ф «Астэрыкс і Абелікс: вялікая бойка».
**9.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**9.10, 2.40 Маст. фільм «Жандар у Нью-Ёрку».**
**10.50 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**12.30** М/ф «Прыгоды капітана Врунгеля».
**13.10** Мюзікл «Залаты ключык».
**15.10, 1.40 Серыял «Гаражы».**
**18.10 Серыял «Куля-Дурніца. Агента амаль не відаць».**
**21.25 Маст. фільм «Мой лепшы палюбоўнік».**
**23.15 Маст. фільм «Пакроўскія вароты».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Звычайны цуд».**
**9.25 Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.20** «Суботнік».
**12.00, 14.10 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі. Выклік лёсу».**
**15.00 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».**
**16.15 Маст. фільм «Мой прынц».**
**18.05** «Крывое люстэрка».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.25 Маст. фільм «Залатыя нажніцы».**
**22.15** Фінал Першай лігі Міжнароднага саюза КВЗ.
**0.05 Маст. фільм «Гаспадыня вялікага горада».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Іх норавы».
**8.55** «З песні слоў не выкінеш!».
**10.20 Серыял «Урач».**
**13.20 Серыял «Настаўнік у законе. Працяг».**
**16.50 Маст. фільм «Каханне пад грыфам «Зусім сакрэтна-2».**
**18.30** «І зноў прывітанне!».
**19.25 Серыял «Аперацыя «Лялькавод».**
**22.55 Камедыя «Зноў Новы».**
**0.35** «Таямнічая Расія».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.45, 18.55, 20.55, 23.35** «Надвор'е».
**9.05** «Мультпарад».
**9.15 Камедыя «Адзін дома».**
**11.20** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.30 Баявік «Судны дзень, Тэрмінатар-2».**
**13.50 Трылер «Місія невыканальная-2».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.35 Фільм — дзецям. «Сабрына — маленькая ведзьма». 1—2-я серыі.**
**17.20 Серыял «Прыгажуня і пачвара».**
**19.00 Камедыя «Дзевяць ярдаў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Неверагодная магія».
**21.10 Драма «Гетсбі».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.30** «Наш Новы год!» Залатыя васьмідзясятыя. «Наш Новы год!» Ліхія дзевяностыя.
**13.00** «Навагоднія гісторыі».
**14.00** «Навагодні тыдзень ежы».
**15.00** «Зоркавы Новы год!».
**16.00 Меладрама «Верабейка».**
**18.00, 0.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**19.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**20.00, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**21.00 «Маладзёжка». Фільм аб фільме.**
**22.15** «Добрыя жарты».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.20** «Наглядальнік». Святлана Кручкова і Алена Ільіна.
**10.15** «Больш, чым каханне». Марына Цвятаева, Райнер Марыя Рыльке і Барыс Пастарнак.
**11.00** «Сакрэты старых майстроў». Абрамцава.
**11.15** Знакамітыя інкогніта. «Антон Адасінскі і тэатр «DEREVO».
**11.50, 0.55** «Афрыка». Дак. серыял.
**12.40** «Брэменскія музыканты». «Па слядах брэменскіх музыкантаў». М/ф.
**13.20** «Іль Дзіва». Канцэрт.
**14.15** «80 гадоў Зурабу Цэрэтэлі. «Вялікая сям'я».
**15.10** «Школа ў Новым Свеце». Дак. серыял.
**15.50** «Тыя, з якімі я... Вячаслаў Ціханаў». Частка 1-я.
**16.20** «Сусветныя скарбы культуры».
**16.35** «Кумір. Сяргей Лемешаў». Дак. фільм.
**17.15 «Музычная гісторыя». Маст. фільм.**
**18.40** Маргарыце Эскінай прысвячаецца... Вечар у Доме акцёра.
**19.40** «Марачы пра сябе іншую. Марына Няёлава». Частка 3-я.
**20.10** «Раберта Аланья. Сіцылійская ноч».
**21.05 «Шлюб караля Густава III». Маст. фільм.**
**0.00** «Ноч камедый» у Альберт-холе.
**1.50** «Франчэска Петрарка». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Доміcолька». Навагодняе казачнае прадстаўленне для дзяцей. 1994 год.
**5.40** «Навагодні мультканцэрт». 1985 год.
**6.35, 0.40 «Дом, які пабудаваў Свіфт». Маст. фільм.**
**7.40** «Песні розных гадоў». Фільм-канцэрт.
**8.00, 14.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**10.05** «Рытмы планеты». 1985 год.
**11.10** «Для вас, бацькі!». 1981 год.
**11.40** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**12.15** «Піф-паф ой-ой-ой». М/ф.
**12.35 «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Маст. фільм.**
**13.40** «Добрай ночы, малышы».
**15.00** «Колба часу».
**16.00** «Кінапанарама». Навагодні выпуск. 1984 год.
**17.00** Навагодні кінаканцэрт. 1983 год.
**18.00** «50/50». 1994 год.
**19.30** «Тэатральныя сустрэчы». 1975-1976 гг.
**21.00 «Меладрама з замахам на забойства». Маст. фільм.**
**22.10** «Цуды на Вераб'ёвай гары». Канцэрт.
**23.00** «Клуб падарожнікаў». 1987/88 гг.
**0.10** «Віншаванні «Навагодняму агеньчыку». Канцэрт.
**4.00** «Навагодні атракцыён». Фільм-канцэрт.

### EUROSPORT

**9.45, 2.30** Ралі-рэйд. Афрыка Эка Рэйс.
**10.00** Лыжнае двaяборʼе. Кубак свету.
**11.00, 14.15, 18.45** Біятлон. Кубак свету.
**11.45, 15.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**13.00, 18.00** Лыжныя гонкі. Тур дэ Скі.
**16.00, 23.45, 2.45** Скачкі на лыжах. Турнэ 4-х трамплінаў.
**19.45** Санны спорт. Кубак свету.
**21.40** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе.
**21.45** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**23.40** Sport Excellence.
**0.40** Fight Club Special.
**0.45** Байцоўскі клуб.
**2.00** Ралі. ERC.
***3.30 — Тэхнічны перапынак.***

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 11.00, 16.40, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.15** Камедыя «Вяртанне высокага бландзіна».
**6.30** Прыгоды «Эйс Вентура. Вышук свойскіх жывёл».
**7.55** Камедыя «Ёлкі».
**9.25** Камедыя «Ужо хто б казаў-3».
**11.20** Прыгоды «Эйс Вентура 2: Калі кліча прырода».
**12.50, 18.35** «Камедыянты. Лепшае».
**13.15** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**15.00** Камедыя «Ёлкі 2».
**17.00** Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
**18.50** Камедыя «Шэф».
**20.20** Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
**22.10** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены».
**23.40** Камедыя «Любоўь-морковь».
**1.30** Камедыя «Вайна прыгажунь».
**3.00** Камедыя «Мы — легенды».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.50, 5.15** Серыял «Сябры».
**11.10** Дак. фільм «Хто прыдумаў Пуаро».
**11.55, 1.30** Маст. фільм «Пакроўскія вароты».
**14.30, 1.00** «Тайны нашага кіно. «Пакроўскія вароты».
**15.00, 3.45** Маст. фільм «Ціхія сосны».
**16.45** М/ф «Балта 2».
**18.00** «Асцярожна, махляры!».
**18.30** Маст. фільм «Адзін дома 3».
**20.30** Маст. фільм «Вялікае каханне».
**22.30** Маст. фільм «Ты і я».
**0.15** Серыял «Падмані мяне».

### ТБ1000

**5.00, 14.25** Баявік «Чалавек-павук».
**7.10** Камедыя «Сімона».
**9.15** Меладрама «Штосьці новенькае».
**11.00** М/ф «Гнамеа і Джульета».
**12.30** Баявік «Дзікая рака».
**16.35** Баявік «Чалавек-павук 2».
**18.50 Драма «Крывавы алмаз».**
**21.25** Драма «Небяспечны метад».
**23.10** Трылер «Сховішча».
**1.10** Камедыя «СМСуальнасць».
**2.45** Драма «Працяглыя заручыны».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Драма «Снежная каралева».
**8.00** М/ф «Карлік Нос».
**9.30** Меладрама «Мамы».
**11.30** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмства».
**13.00, 4.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
**14.30** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**16.00** М/ф «Тры багатыры і Шамаханская царыца».
**18.00** М/ф «Іван Царэвіч і шэры воўк».
**20.00** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
**22.20** Драма «Легенда №17».
**0.40** Камедыя «Атамны Іван».
**2.25** Камедыя «Спатканне» (A Date).

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 13.00** Прыручыць дракона.
**6.00** Злавіць сома.
**7.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**8.00** Дзікі тунец.
**9.00** Золата Юкана.
**10.00** Цяжкае золата Аляскі.
**11.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**12.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**14.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці.
**19.00, 23.00, 4.00** Расследаванні авіякатастроф.
**20.00, 0.00, 3.00** Катастрофа ў рэальным часе.
**21.00, 1.00** Сутыкненне з астэроідам.
**22.00, 2.00** Камета стагоддзя.

### DISCOVERY

**7.00, 17.50** Як гэта ўстроена?
**7.25, 16.25** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**8.15, 19.10, 2.40** Хлопцы з Юкана.
**9.10, 18.15** Эд Стафард: голае выжыванне.
**10.05** Чалавек, гепард, прырода.
**11.00** Багажныя войны.
**11.50** Грошы ў засеках.
**12.45, 5.10** Бітва за нерухомасць.
**13.40, 6.05** Хуткія і гучныя.
**14.35, 0.55** Пяцёрка лепшых.
**15.30** Не спрабуйце паўтарыць.
**17.20, 4.55** Як гэта зроблена?
**20.05** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**21.00** Зброя, якая змяніла свет.
**22.00** Я ўцёк.
**23.00** Наёмнікі.
**0.00** Як устроена Зямля.
**1.50** Цуды Сусвету.
**3.30** Залатая ліхаманка.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.

## НЯДЗЕЛЯ, 5 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.45 Камедыя «Службовы раман». 2-я серыя.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10, 1.00 Меладрама «Час кахаць». Заключныя серыі.**
**11.05, 16.25** Давярай і правярай.
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10** «Зона Х».
**12.40** Каробка перадач.
**13.10** «XXL WOMAN TV».
**13.40** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**14.10** «Зорнае жыццё». «Акальцаваць халасцяка».
**15.15** Твой горад.
**15.30** Урачэбныя тайны.
**16.05** Eurovision. Вынікі тыдня.
**16.55** Прыгоды «Хронікі Нарніі: Леў, Вядзьмарка і чарадзейная шафа».
**19.15 Меладрама «Час шчасця-2».**
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.30 Трылер «Адрачэнцы».**
**21.10** Навіны надвор'я.
**21.45 Камедыя «Крок наперад-2: Вуліцы».**
**0.20** Прыгоды «Гісторыя рыцара».

### БЕЛАРУСЬ 2

**8.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**8.50** Заўтра — гэта мы!
**9.20 Баявік «Людзі ў чорным-2».**
**10.55** Ток-шоу «Аўтабатл».
**11.25** Тэлебарометр.
**11.30** Тэніс. Сідней. Жанчыны.
**13.40, 23.30 Серыял «Таксі».**
**14.40** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**16.45** «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне».
**17.40** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
**19.45** Суперлато.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 11.35, 16.45, 18.40, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.05** «Прыстанак душы».
**8.35** «Кожны мае права быць розным».
**9.05 Дзіцячы фільм. «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка».**
**10.25** «Золата Грышына». Дак. фільм.
**10.55 «Крылатая вясёлка». Навукова-папулярны фільм.**
**11.10** «Наперад у мінулае».
**11.40** «Тысячагадовы Заслаўль». Дак. фільм.
**12.10** «Тэатральны ліцэй». Дак. фільм.
**12.35** «Жалезныя майстры». Дак. фільм.
**12.55** «Пані Перамога рэжысёра Матыля». Фільм-партрэт.
**13.50** «Быль і небыль пра маршала Ракасоўскага». Дак. фільм.
**14.35** «Цябе кахаю, табе і веру...». Памяці Сяргея Ясеніна.
**15.05** «Карані».
**15.40** «Навагодні серпанцін». Святочны канцэрт.
**16.55 «Цень самурая». Маст. фільм. 1-я — 4-я серыі.**
**20.30** Калыханка.
**20.50 Сусветнае кіно. «Авіцэна».**
**22.40** «Без права на дубль». Мікалай Яроменка-малодшы.
**23.30** «АРТіШОК».

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.25, 18.50** Тэніс. Турнір ВТА. Фінал.
**10.55** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). 1/2 фіналу.
**12.45** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
**14.35** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследавання. Жанчыны.
**15.30** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**16.25** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). Матч за 3-е месца.
**20.55** Хакей. Чэмпіянат свету (U-20). Фінал.
**22.55** Хакей. Калядны турнір. Беларусь — Германія.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
**9.20 Камедыя «Ах, вадэвіль, вадэвіль, вадэвіль...».**
**10.35 Камедыя «Зусім сакрэтна».**
**11.50 Маст. фільм «Стары Хатабыч».**
**13.25** «Брэйн-рынг».
**14.35** М/ф «Ледніковы перыяд».
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Ледніковы перыяд: Гіганцкія Каляды».
**16.45** Музычны фестываль «Голосящий КиВиН».
**20.00** Контуры.
**21.05 Серыял «Тры мушкецёры».**
**23.05** «Што? Дзе? Калі?». Фінал года.
**0.50 Камедыя «Як выйсці замуж за мільянера».**

### СТБ

**6.20 Маст. фільм «У маёй смерці прашу вінаваціць Клаву К.».**
**7.40 Фантастыка «Матрыца».**
**10.00, 17.40** «Аўтапанарама».
**10.30** «Тайны свету».
**11.30** «Вялікае снеданне».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45 Маст. фільм «Баламут».**
**14.25** «Не дай сябе апакеманіць!». Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Дзіўная справа».
**18.10** «На тым жа месцы ў той жа час».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Загадкавая гісторыя Бенджаміна Батана».**
**23.40** Пераможца ў намінацыі «Лепшы канцэрт года» Нацыянальнай музычнай прэміі, канцэрт Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь «Дым над вадой».

### МІР

**5.00** М/ф.
**7.30** М/ф «Астэрыкс і Абелікс заваёўваюць Амерыку».
**9.00, 15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**9.10, 2.55 Маст. фільм «Жандар жэніцца».**
**10.45 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**12.30** М/ф «Прыгоды капітана Врунгеля».
**13.10** Мюзікл «Каралеўства крывых люстэркаў».
**15.10, 1.00 Серыял «Гаражы».**
**18.10 Серыял «Куля-Дурніца. Агент для спадчынніцы».**
**21.20 Маст. фільм «Чатыры пахаванні і адно вяселле».**
**23.05** Мюзікл «Каралеўства крывых люстэркаў».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Безыменная зорка».**
**9.20 Маст. фільм «Толькі ў мюзік-холе».**
**10.35, 11.20 Маст. фільм «Каралі».**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**12.40, 14.10 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі-3».**
**16.40 Маст. фільм «Снягурку выклікалі?».**
**17.50** «Крывое люстэрка».
**20.25 Маст. фільм «Кіраўнік гаспадаркі».**
**22.05 Маст. фільм «Дзеля цябе».**
**1.20** «Жывы гук».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Іх норавы».
**8.55** «З песні слоў не выкінеш!».
**10.20 Серыял «Урач».**
**13.25 Серыял «Настаўнік у законе. Вяртанне».**
**16.50 Маст. фільм «Каханне пад грыфам «Зусім сакрэтна-3».**
**18.30** «І зноў прывітанне!».
**19.25 Серыял «Аперацыя «Лялькавод».**
**22.55 Маст. фільм «Сібірак».**
**0.35** «Таямнічая Расія».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 12.55, 18.50, 20.55, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** Мультпарад.
**9.30** «Мой любімы гадаванец».
**10.00** «Адшукваецца адпачынак».
**10.30, 23.25** «Кінаблакнот».
**10.45 Камедыя «Новая казка пра Папялушку».**
**13.00 Камедыя «Іван Васільевіч мяняе прафесію».**
**14.40** М/ф «Сабака ў ботах».
**15.00** «Сёння клюе».
**15.30 Серыял «Камісар Рэкс».**
**17.15** Ток-шоу «Бульбокс».
**17.45 Серыял «Лэдзі дэтэктыў».**
**18.55 Баявік «Людзі ў чорным».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Меладрама «Размаляваная вуаль».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.30** М/ф «Смяшарыкі».
**9.30 Серыял «Татавы дочкі».**
**10.30** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**11.30, 0.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**12.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**12.30, 15.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**13.00 «Маладзёжка». Фільм аб фільме.**
**15.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**16.00** «Добрыя жарты».
**20.00** «Людзі хэ».
**20.30** «Нерэальная гісторыя».
**21.00 Кінапародыя «Вельмі рускі дэтэктыў».**
**0.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».

### КУЛЬТУРА

**5.30** «Еўраньюс».
**9.00** Навіны культуры.
**9.20** «Наглядальнік». Раман Вікцюк і Валянцін Гафт.
**10.15** Фільм-спектакль «Мне сніўся сон...». Рэжысёр Р. Вікцюк.
**11.00** «Сакрэты старых майстроў». Фядоскіна.
**11.15** Знакамітыя інкогніта. «Загадка голасу Саінхо Намчылак».
**11.50, 0.55** «Афрыка». Дак. серыял.
**12.40** «Храбры кравец». «Цудоўны званок». М/ф.
**13.30** «Раберта Аланья. Сіцылійская ноч».
**14.25** Алег Шэйнцыс. «Эпізоды».
**15.10** «Школа ў Новым Свеце». Дак. серыял.
**15.50** «Тыя, з якімі я... Вячаслаў Ціханаў». Частка 2-я.
**16.15** Да юбілею кінастудыі. «Масфільм». 90 крокаў».
**16.30 «Кін-Дза-Дза!» Маст. фільм.**
**18.40** Творчы вечар Юрыя Стаянава ў Доме акцёра.
**19.40** «Марачы пра сябе іншую. Марына Няёлава». Частка 4-я.
**20.10** Джо Дасен. Канцэрт.
**21.10 «Марыя-Антуанета». Маст. фільм.**
**23.05** Джэймі Калум. Канцэрт.
**0.00** Па слядах тайны. «Неверагодныя артэфакты». Дак. фільм.
**0.45** «Жыў-быў Казявін». М/ф.
**1.50** «Кацусіка Хакусай». Дак. фільм.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Для вас, бацькі!». 1981 год.
**5.35** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**6.10** «Піф-паф ой-ой-ой». М/ф.
**6.30 «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Маст. фільм.**
**7.40** «Добрай ночы, малыя».
**8.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00** «Колба часу».
**10.00** «Кінапанарама». Навагодні выпуск. 1984 год.
**11.00** Навагодні кінаканцэрт. 1983 год.
**12.00** «50/50». 1994 год.
**13.30** «Тэатральныя сустрэчы». 1975-1976 гг.
**15.00 «Меладрама з замахам на забойства». Маст. фільм.**
**16.10** «Цуды на Вераб'ёвай гары». Канцэрт.
**17.00, 19.00** «Шынок 13 крэслаў». 1969 год.
**18.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**20.00** «А трынаццатай гадзіне ночы». Фільм-канцэрт.
**21.20** «Чатыры інтэрв'ю з зімой». Фільм-канцэрт.
**22.30 «Запасное кола». Кароткаметражны фільм.**
**23.00** «Доміcолька». Навагодняе казачнае прадстаўленне для дзяцей. 1994 год.
**23.40** «Навагодні мультканцэрт». 1985 год.
**0.35 «Дом, які пабудаваў Свіфт». 2-я серыя. Маст. фільм.**
**1.40** «Песні розных гадоў». Фільм-канцэрт.
**4.05** «Рытмы планеты». 1985 год.

### EUROSPORT

**9.45** Ралі-рэйд. Афрыка Эка Рэйс.
**10.00, 11.45** Лыжнае двaяборʼе. Кубак свету.
**11.00, 16.15, 18.30, 0.00** Скачкі на лыжах. Турнэ 4-х трамплінаў.
**12.45, 14.30, 17.45, 19.30, 20.15** Біятлон. Кубак свету.
**13.30** Санны спорт. Кубак свету.
**15.30, 16.45** Лыжныя гонкі. Тур дэ Скі.
**19.20. 23.55** Sport Excellence.
**19.25, 0.55** Зімовы ўік-энд.
**20.10, 22.00, 1.00, 3.00** Ралі. Дакар.
**21.00, 22.05** Дартс. Чэмпіянат свету.
**1.25, 2.55** Адкрыты чэмпіянат Аўстраліі па тэнісе.
**2.00** Ралі. ERC.
**2.30** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
***3.30 — Тэхнічны перапынак.***

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 16.40, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.15** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**6.55** Камедыя «Ёлкі 2».
**8.35** Камедыя «Ужо хто б казаў-3».
**10.15** Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
**11.45** Камедыя «Шэф».
**13.15** Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
**15.00** Камедыя «Сардэчна запрашаем, або Суседзям уваход забаронены».
**17.00** Камедыя «Алмазны сабака».
**18.50** Камедыя «Спатканне».
**20.20** Камедыя «Выкрутасы».
**22.10** Камедыя «Мой хлопец — Анёл».
**23.45** Камедыя «Любоўь-морковь 2».
**1.30** Прыгоды «Эйс Вентура. Вышук свойскіх жывёл».
**3.00** Камедыя «Лары Краўн».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.40, 4.05** Серыял «Сябры».
**10.55** «Паненка і кулінар».
**11.30, 2.25** Серыял «Блізняты».
**13.30** «Жонка. Гісторыя кахання». Вера Васільева.
**15.00** «Сто пытанняў даросламу». Мікалай Растаргуеў.
**15.55, 0.45** Маст. фільм «Няўдача Пуаро».
**17.50** «Дэфіле па-руску».
**18.20** Маст. фільм «Адзін дома 4».
**20.15** Маст. фільм «Матрыца».
**22.50** «Часова даступны». Павел Санаеў.
**23.55** Серыял «Падмані мяне».

### ТБ1000

**5.00** Баявік «Чалавек-павук 2».
**7.15** Баявік «Дзікая рака».
**9.15** Камедыя «СМСуальнасць».
**11.00** Трылер «Сховішча».
**13.15** Драма «Крывавы алмаз».
**15.50** Баявік «Чалавек-павук 3».
**19.00** Трылер «Харошы немец».
**21.00** Драма «Працяглыя заручыны».
**23.40** Драма «Скарб».
**1.35** Трылер «Паляўнічы на забойцаў».
**3.20** Камедыя «Тайны знак».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.30** Дэтэктыў «Сіняя барада».
**7.20** М/ф «Іван Царэвіч і шэры воўк».
**9.00** Фэнтэзі «Рыжык у Залюстроўі».
**11.20** Мюзікл «Снягурка».
**13.00** Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў (1)».
**14.30** М/ф «Пра Фядотастральца, удалага малайца».
**16.00** М/ф «Карлік Нос».
**18.00** М/ф «Дабрыня Мікіціч і Змей Гарыныч».
**20.00** Драма «Збавенне».
**22.15** Камедыя «Спатканне» (A Date).
**0.00** Камедыя «Са мной вось што адбываецца».
**2.00** Драма «Духless».
**4.00** Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 13.00** Выратаваны львіцай.
**6.00** Злавіць сома.
**7.00** Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
**8.00** Дзікі тунец.
**9.00** Золата Юкана.
**10.00** Цяжкае золата Аляскі.
**11.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**12.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**14.00** Сесар Мілан: Важак зграі.
**15.00** Дзікая прырода Расіі.
**16.00** Тайныя гісторыі НЛА.
**17.00** Брытанскія НЛА.
**18.00** Паранармальнае.
**20.00** Судны дзень Амерыкі.
**21.00, 0.00, 3.00** Замак: перажыць Армагедон.
**22.00, 1.00, 4.00** Неверагодна маленькі свет.
**23.00, 2.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00, 8.40** Як гэта ўстроена?
**7.25** Бітва за нерухомасць.
**8.15, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.10** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**10.00, 20.05, 3.30** Разбуральнікі легенд.
**10.55, 21.00** Не спрабуйце паўтарыць.
**11.50** Пяцёрка лепшых.
**12.45** Як устроена Зямля.
**13.40** Цуды Сусвету.
**14.35** Залатая ліхаманка.
**16.25** Матарэстаўрацыя.
**19.10** Як стварыць біянічнага чалавека.
**22.00** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**23.00, 2.40** Пад забаронай.
**0.00** Зброя, якая змяніла свет.
**0.55** Наёмнікі.
**1.50** Я ўцёк.
**4.20** Маланкавыя катастрофы.
**5.10** Новы свет.
**6.05** Хуткія і гучныя.

# СТРАСЦІ ПА САЮЗЕ

## АМАЛЬ 13 ГАДЗІН МАСТАКІ ВЫБІРАЛІ НОВАГА СТАРШЫНЮ

**І насамрэч даволі нямногія могуць пахваліцца, што пратрымаліся да канца. Акрамя таго, што XXI з'езд Саюза мастакоў, на якім традыцыйна раз на тры гады выбіраюць новага старшыню, цягнуўся столькі часу, дык праходзіў яшчэ ў даволі «гарачай» атмасферы. У выніку старшынёй абралі мастака-графіка Рыгора Сітніцу.**




### ПРЭТЭНЗІІ

Да Саюза мастакоў апошнім часам з усіх бакоў было даволі шмат прэтэнзій. Беларускія медыі скардзіліся на тое, што гэта вельмі закрытая арганізацыя, якая хоць і не адмаўляе ў інфармацыі, калі туды па яе звяртаешся, але сама ніяк не ідзе насустрач прэсе. Пра адкрыццё выстаў Саюза часам даведацца даволі складана, але, здараецца, інфармацыя пра іх становіцца даступнай з нейкіх іншых крыніц, а не наўпрост.

Апошнія 6 гадоў на пасадзе старшыні Саюза быў мастак Уладзімір Савіч. Істотны раскол паміж мастакамі ў Саюзе пачаўся ў апошнія пару гадоў. Праціўнікі «курсу Савіча» скардзіліся на адсутнасць празрыстай сістэмы размеркавання майстэрняў, бяздзейнасць кіраўніцтва Саюза ў вырашэнні пытанняў ільгот для мастакоў па аплаце майстэрняў, адсутнасць празрыстай сістэмы размеркавання дзяржзаказаў і многае іншае. Напрыклад, вялікія непаразуменні выклікала размеркаванне заказаў на мастацкае аздабленне так званага аб'екта № 1 — Палаца Незалежнасці. Словам, з'езд выглядаў як высвятленне стасункаў у сям'і, дзе пачаліся розныя непаразуменні. Сябры Саюза раскалоліся на два, а то і больш лагераў, кожны з якіх спавядаў нейкую сваю ісціну.

Наогул, ёсць пытанні адносна эфектыўнасці і працаздольнасці такой грувасткай арганізацыі, як Саюз мастакоў, ва ўмовах актуальнага мастацтва. Вельмі слушна пра гэта сказаў мастак Руслан Вашкевіч. Ён адзначыў, што маладыя мастакі ідуць у Саюз выключна дзеля магчымасці атрымаць майстэрню. Але гэта таксама не так проста. Сістэматызаванай чаргі на атрыманне майстэрні няма, а таму гэта з'яўляецца дадатковай глебай для спекуляцый. Словам, можна сказаць, што Саюз не ўдзельнічае актыўна ў мастацкім жыцці (гэтым займаюцца мастакі самі, прыватныя інстытуцыі, галерэі), а з той ці іншай доляй поспеху займаецца выключна каардынацыйнай дзейнасцю. У многім — па інерцыі, якая засталася з савецкіх часоў. Саюзу мастакоў, каб выжыць у сучасных умовах, відавочна не хапае добрага менеджменту і кураtарскіх падыходаў.

***ВАРТА НАВЕДАЦЬ:***

*Да XXI з'езда Беларускага саюза мастакоў прымеркаваная выстава, якая працуе ў Палацы мастацтваў, пад трывіяльнай назвай «Ад з'езда да з'езда». Займае яна ўсю плошчу палаца і складаецца з твораў апошніх гадоў. Па сутнасці, гэта выстава без уцямнай канцэпцыі. На ёй сабрана ўсё: скульптура, графіка, жывапіс, інсталяцыя, габелен. Колькасць аўтараў такая ўнушальная, што дакладна ўдзельнікаў цяжка падлічыць. Але тут вы знойдзеце творы Андрэя Басалыгі, Віктара Мацура, Алеся Пушкіна, Васіля Васільева, Жанны Капуснікавай, Уладзіміра Тоўсціка ды іншых. І хаця такія «салянкі» выглядаюць ужо зусім старамодна, выставу «Ад з'езда да з'езда» варта наведаць хаця б дзеля таго, каб паглядзець, што за апошнія гады зрабілі асобныя аўтары.*

### МЕНЕДЖАР ЦІ МАСТАК?

Усе, хто балатаваўся на пасаду старшыні Саюза мастакоў, людзі прыблізна аднаго пакалення. Тое, што ў іх ёсць свая пазіцыя і погляд на тое, як павінна працаваць арганізацыя, — бясспрэчна. Але вось ці змаглі б яны ўсё гэта арганізаваць, скаардынаваць — пытанне. Усё-такі творцы — людзі часта неарганізаваныя. Магчыма, таму мастацтвазнаўца Таццяна Бембель і выказала думку пра тое, што ўзначальваць Саюз павінен не мастак, а добры менеджар, які добра разбіраецца ў мастацтве, праблемах і пытаннях, якія хвалююць мастакоў.

На пасаду старшыні балатаваліся Уладзімір Слабодчыкаў, Мікалай Гушчык, Рыгор Сітніца, Генадзь Буралкін і Алесь Суша. Пасля непаразуменняў, якія папярэднічалі выбарам, ніхто нават не спадзяваўся на тое, што выбары старшыні пройдуць за адзін тур. Але Рыгор Сітніца набраў найбольшую колькасць галасоў у першым туры. На пасаду свайго намесніка новы старшыня прапанаваў скульптара Аляксандра Дранца, аўтара скульптуры Францішка Скарыны каля Нацыянальнай бібліятэкі. Уладзімір Савіч цяпер будзе ўзначальваць секцыю графікі.

У Рыгора Сітніцы наперадзе тры складаныя гады, за якія ён паабяцаў зрабіць шмат. Перш за ўсё скончыць рамонт Палаца мастацтваў. Ёсць верагоднасць, што Палац удасца пераtварыць у суперсучасны арт-цэнтр нацыянальнага значэння пры ўдзеле аднаго з самых буйных інвестараў у нашай краіне.

Надзвычай важнай з'яўляецца, на думку Рыгора Сітніцы, і нармалізацыя стасункаў паміж мастакамі ўнутры Саюза. Каб падобных расколаў, які здарыўся напярэдадні XXI з'езда, больш не было. Супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі па ўсіх напрамках з мэтай абароны правоў мастакоў — яшчэ адзін кірунак. Гэта і наладжванне належнай інфармацыйнай падтрымкі мерапрыемствам, якія ладзіць Саюз, і вырашэнне пытання льгот для мастакоў на арэнду майстэрняў. Застаецца хіба што спадзявацца, што новы старшыня стрымае свае высакародныя абяцанні. А выставы Саюза будуць настолькі цікавымі і годнымі, што, як кажуць, інфармацыйная падтрымка сама падцягнецца. Бо метадам прымусу, як вядома, нічога добрага не дабіцца. А вось калі ўдасца абудзіць шчыры інтарэс гледача да выставаў, гэта можа істотна палепшыць сітуацыю ў беларускім мастацтве.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**
**Фота аўтара.**

***Каментарый Рыгора СІТНІЦЫ:***

*— Найгалоўнейшым для нашага Саюза застанецца, безумоўна, адстойванне правоў мастакоў. Трэба працягваць весці перамовы з уладнымі структурамі, інстытуцыямі. Балазе там ёсць людзі, якія разумеюць праблемы мастакоў. Што тычыцца, аплаты майстэрняў, то, вядома, я не лічу, што яна павінна прыраўнавацца да нуля. Але чаму мастакі павінны плаціць за камунальныя паслугі амаль у 10 разоў больш, чым звычайныя жыльцы, незразумела. Вельмі хочацца, каб нас пачулі і пайшлі на некаторыя саступкі. Тут нельга казаць, што мы зусім пакрыўджаны дзяржавай. Мы маем шмат прэферэнцый, якія дапамагаюць нам выжываць. Але, безумоўна, хочацца большага. Мы гатовыя супрацоўнічаць з Міністэрствам культуры, Міністэрствам інфармацыі, Белтэлерадыёкампаніяй для дасягнення вынікаў.*




■ Святочнае

# І ДЗЯДАМ МАРОЗАМ БЫЛО ГОРАЧА...

Нягледзячы на тое, што надвор'е моцна пасябравала з адзнакай плюс, адмяняць загадзя запланаванае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак па сталічных плошчах, вуліцах і праспектах ніхто не збіраўся. Падумаеш, няма снегу і без пальчатак не мерзнуць рукі. У Аўстраліі, напрыклад, цяпер у самым разгары пляжны сезон, але на калядны настрой адмоўна гэта не ўплывае.

Па меркаваннях некаторых сродкаў масавай інфармацыі і інтэрнэт-парталаў, сёлета ў касцюміраваным шэсці прынялі ўдзел каля 800 казачных персанажаў. Вялікая калона Дзядоў Марозаў і Снягурак працягнулася ад Кастрычніцкай плошчы да Палаца спорту. Як заўсёды, яе ўзначальвалі галоўныя Дзед Мароз і Снягурка, але, у адрозненне ад мінулых гадоў, цяпер першых асоб зімы везлі на карэце, запрэжанай статным наравістым рысаком.

Падчас канцэртнай праграмы на ўзбярэжжы Свіслачы, пачуўшы вясёлую музыку, у скокі кідаліся дзеці і бацькі, вясёлыя скамарохі, белабародыя Дзяды з чароўнымі спадарожніцамі Снягуркамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара**










| Даты | Падзеі | Людзі |
|---|---|---|

**1847** год — нарадзіўся (вёска Турын, цяпер Пухавіцкі раён) Якуб Антонавіч Наркевіч-Ёдка, беларускі прыродазнавец, вынаходнік, медык, доктар медыцыны (1893), прафесар (1900), член-карэспандэнт Рускага геаграфічнага таварыства (1889). У 1865 годзе скончыў Мінскую губернскую гімназію, працягваў вучобу ў Парыжы, Фларэнцыі, Вене; вывучаў фізіку, медыцыну. У 1888-м стварыў у сваім маёнтку Наднёман метэаралагічную станцыю. Даследаваў атмасферную электрычнасць. Рэгістраваў навальнічныя разрады з дапамогай тэлефона і прадказваў набліжэнне навальніцы. У сваім маёнтку адкрыў санаторый для лячэння нерваў і хворых на сухоты. Прапанаваў выкарыстанне метаду электраграфіі для дыягностыкі захворванняў. З 1892-га — член-супрацоўнік фізіка-хімічнага таварыства пры Пецярбургскім універсітэце. Памёр у 1905 годзе.

**1862** год — на тэрыторыі Беларусі пачаў эксплуатавацца ўчастак чыгуначнага шляху з Пецярбурга ў Варшаву. Яго адрэзак Парэчча — Гродна стаў першай чыгуначнай лініяй, пракладзенай на беларускай зямлі.

**1908** год — нарадзіўся (горад Екацярынаслаў) Васіль Піліпавіч Маргелаў, Герой Савецкага Саюза (1944), генерал арміі, кандыдат ваенных навук. Беларус. Бацька — Піліп Іванавіч Маркелаў, рабочы-металург. (Прозвішча Маркелаў у Васіля Піліпавіча пасля было запісана як Маргелаў з-за памылкі ў партбілеце.) У 1913 годзе сям'я Маргелава вярнулася на радзіму Піліпа Іванавіча — у мястэчка Касцюковічы Клімавіцкага павета (Магілёўская губерня). Маці В.Ф. Маргелава, Агаф'я Сцяпанаўна, была родам з суседняга Бабруйскага павета. У 1928 годзе прызваны ў Чырвоную Армію. Накіраваны вучыцца ў Аб'яднаную беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР у Мінску, залічаны ў групу снайпераў. У 1939 годзе ўдзельнічаў у паходзе РСЧА на Польшчу. Удзельнік савецка-фінскай вайны (1939–1940). У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года на Ленінградскім, Паўночна-Заходнім, Сталінградскім, Паўднёвым, 3-м і 4-м Украінскіх франтах: камандзір палка, начальнік штаба дывізіі, камандзір дывізіі. Удзельнік баёў пад Ленінградам, Сталінградам, на Дняпры, Днястры, у Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі. З 1946 года — на адказных пасадах у Савецкай Арміі, у 1954–1959-м і 1961–1979 гадах — камандуючы паветрана-дэсантных войскаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1975). Памёр у 1990 годзе. У гісторыі паветрана-дэсантных войскаў, ды і ва Узброеных Сілах Расіі, Беларусі і іншых краін былога Савецкага Саюза яго імя застанецца назаўсёды. Ён увасабляў цэлую эпоху ў развіцці і станаўленні ПДВ, з яго імем звязаны іх аўтарытэт і папулярнасць не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой...




Было сказана

**Андрэй ВОЛЯН, філасоф, палітычны дзеяч, ідэолаг Рэфармацыі на Беларусі:**

*«Калі свабода нам дарагая, дык будзем карыстацца ёю памяркоўна. Інакш неабмежаваная свабода можа пераtварыцца ў сваю процілегласць, гэта значыць, рабства».*

**Паважаныя калегі, сябры!**

Шчыра віншую вас з самымі светлымі святамі — Калядамі і Новым годам!

Як дарожнік са стажам, хачу адзначыць, што дарогі — вялікія магістралі і нават маленькія гравійкі — гэта не толькі артэрыі эканомікі, не толькі камфорт і бяспека, не толькі магчымасць круглы год у любое надвор'е трапіць нават у самую аддаленую вёсачку, але і пуцяводная рыса, каб усім нам не збіцца з курсу.

Наша праца — як паветра. Калі дыхаеш, аб ім нават не задумваешся. Калі ж яго не хапае — жыццё спыняецца. Таму хачу падзякаваць усяму калектыву за вашу пачэсную, нялёгкую, але такую важную працу. Вы клапоціцеся пра кожны кіламетр дарожнага палатна, не даяце яму разбурацца, зарастаць травой, а калі дазваляюць магчымасці — хутка і якасна будуеце новыя сучасныя дарогі, масты і пуцеправоды. Перакананы: дарогі Брэстчыны і надалей застануцца камфортнымі і бяспечнымі, дазволяць усім карыстальнікам імкліва і ўпэўнена рухацца да новых дасягненняў і ў надыходзячым годзе!

Шчасця, здароўя, дабрабыту і новых высокіх дасягненняў!

**Дырэктар КУП «Брэстаблдарбуд» Пётр Андрэевіч Скарабагацька.**

УНП 200020752

Віншуем трактарыста-машыніста **Івана Міхайлавіча КРАЎЧУКА** з узнагародай — Граматай Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, а таксама з Новым годам і Калядамі.

Дзякуй за руплівасць у працы, за ўзаемаразуменне ў калектыве. Жадаем шчасця, здароўя і даўгалецця.

З павагай, адміністрацыя і камітэт прафсаюза дзяржаўнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Ляхавіцкае ПМС».

УНП 200057737

**Продается легковой а/м ГАЗ-31105, 2004 г.в., седан, бензин, серебристый металлик, объем 2,3 см куб., пробег 171 500 км, в хорошем состоянии.**

**Цена договорная. Продавец — РИУ «Издательский дом «Звязда», г. Минск.**

***Тел.: 8 (017) 287 17 40, 287 19 19.***

**ПРАДАЮ**

Маразільнік «Атлант» 5-камерны, б/к, у добрым стане. Нядорага.

*Тэл.: 8 0214 74 70 24, 8 029 874 28 38.*

Участак 8 сотак, 25 км ад МКАД г. Мінск, кантэйнер 4х4 м, 5000 у.а.

*Тэл. 8 044 724 55 90.*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.28 | 16.53 | 7.25 |
| Віцебск | — 9.26 | 16.35 | 7.10 |
| Магілёў | — 9.19 | 16.43 | 7.24 |
| Гомель | — 9.06 | 16.48 | 7.42 |
| Гродна | — 9.42 | 17.10 | 7.28 |
| Брэст | — 9.34 | 17.19 | 7.45 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 25 снежня. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Калініка, Мікалая, Філімона.*
***К.*** *Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

Пайду я ў госці, а то ж, мярзотнікі, самі прыпруцца.

**Дзве сяброўкі.**
**— Учора бачыла прывід!**
**— Ты што? Чый?**
**— Лёшкі Сакалова — памятаеш, з паралельнага класа?**
**— І дзе ты яго бачыла?**
**— У рэстаране, за суседнім столікам.**
**— А з чаго ўзяла, што ён здань?**
**— Дык ён тады, яшчэ дзесяць гадоў таму, сказаў, што не зможа жыць без мяне...**

Мужыкі! Зіма дае вам адзіную магчымасць зляпіць сабе бабу на свой густ! Не ўпусціце шанц!

**— Прывітанне, даўно не бачыліся! Як здароўе?**
**— Табе цікава? Пачну з аналізаў...**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.758. Індэкс 63850. Зак. № 5519.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2013 года.